

ЭКСТРАННАЯ ПАСАДКА: КАМЕНТАРЫІ ЭКСПЕРТАЎ 3

ЛЕГЕНДЫ КОСАЎСКАГА ПАЛАЦА 12



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

25 МАЯ 2021 г. АЎТОРАК № 96 (29465)

**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Ігар ПЕТРЫШЭНКА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Сёлета ў летні перыяд плануецца аздаравіць больш як 340 тысяч дзяцей. Асаблівы акцэнт павінен быць зроблены на недапушчальнасці адкрыцця летнікаў без безумоўнага захавання выпрацаваных у краіне санітарна-эпідэміялагічных патрабаванняў і рэкамендацый па прафілактыцы і распаўсюджванні каранавіруснай інфекцыі. На правядзенне дзіцячай летняй аздараўленчай кампаніі 2021 года выдзелена 46,6 мільёна рублёў сродкаў рэспубліканскага бюджэту. У тым ліку 44,4 мільёна — на патаненне кошту пуцёвак у аздараўленчыя, спартыўна-аздараўленчыя летнікі, 1,6 мільёна — на набыццё пуцёвак у лагеры для льготных катэгорый дзяцей. Кошт пуцёўкі складзе ад 108 да 617 рублёў у залежнасці ад тыпу летніка і тэрміну знаходжання».*

# МЫ РОДАМ З ГРАЎЖЫШАК



Народны ансамбль «Граўжанцы» не перастае здзіўляць сваімі непаўторнымі галасамі, душэўнымі песнямі, зладжаным жывым акампанементам. Адна з адметнасцяў гурта ў тым, што ўсе ўдзельнікі — і музыканты, і пявунні — родныя і сваякі. А душа калектыву, несумненна, — пазітыўны і настраёвы гарманіст і баяніст Васіль СІДАРОВІЧ. Да яго, як да сонца, горнуцца ўсе артысты, з ім не бывае сумна, бо самабытны талент заўсёды прыцягвае. Цяпер такія сямейныя калектывы, у якіх больш за дзесяць чалавек, нячаста ўбачыш, пачуеш. «Граўжанцы» трымаюць марку, шануюць сваю рэпутацыю і аўтарытэт!

Нядаўна давялося пабыць у Ашмянскім раёне і наведаць Граўжышкі. А якая сустрэча з гэтай вядомай вёскай, калі не пабачыш адмысловых артыстаў, не паслухаеш іх мілагучнае выкананне? Гэтым разам гурт рэпеціраваў перад адказным канцэртам. Побач з Васілём Міхайлавічам шчыравалі яго стрыечны брат Эдуард БУЛКЕВІЧ і дзве сваячкі Алены — КАШЧЫЦ і САЛЬМАНОВІЧ *(на фота)*. На сайце «Звязды» можна паглядзець нават невялікае відэа з гэтай сустрэчы.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

**КОРАТКА**

- **Сярэдні заробак у Беларусі ў красавіку склаў Br1398,2.**
- Гран-пры форуму «Папараць-кветка БДУ» заваяваў народны хор «Белая вежа».
- **Экспарт беларускай сельгаспрадукцыі ў Кітай вырас на 87,7 %.**
- Ратавальнікі правялі другі выбух будынка завода «Легмаш» у Оршы.



- **Дэзынфекцыя транспарту для ўезду праз «Новую Гуту» з 1 ліпеня будзе абавязковая.**
- У Гомельскай вобласці ў студзені—красавіку раскарчавалі 550 га сельгасзямель.

Разумныя грошы

## РУБЕЛЬ УМАЦОЎВАЕЦЦА

**Пакуль рана казаць аб заканчэнні крызісу, выкліканага пандэміяй COVID-19. Аднак валютны рынак дэманструе дзіўную ўстойлівасць, а беларускі рубель умацоўваецца. Па выніках біржавых таргоў 21 мая курс долара склаўся на ўзроўні 2,5092 рубля, што значна ніжэй за максімум бягучага года. Мы пастараемся адшукаць прычыны такіх «паводзінаў» валют на нашым рынку.**

### ЗНЕШНІ ГАНДАЛЬ ПРЫНОСІЦЬ «ДЫВІДЭНДЫ»

І сапраўды, аб'ём экспарту ў студзені-лютым гэтага года склаў 6450,8 млн долараў, што на 16 % больш, чым за такі ж перыяд мінулага года. Пры гэтым імпарт паказаў больш сціплы рост — 5694,7 млн долараў, што на 10,3 % больш, чым летась. У выніку станоўчае сальда знешняга гандлю склалася на ўзроўні 756,1 млн супраць 396,4 млн долараў годам раней. Нават знешні гандаль таварамі, які звычайна спрыяў адтоку валюты з краіны, выйшаў у плюс, хай не вялікі (88 млн USD), але ўсё ж.

СТАР. 4

Класныя навіны

## АПОШНІЯ ЗВАНКІ, ЭКЗАМЕНЫ І ВЫПУСКНЫЯ...

### Як яны пройдуць сёлета?

**Рэспубліканскае свята «Апошні званок» пройдзе 27—28 мая ў Бабруйску. Удзел у ім возьмуць каля дзвюх тысяч навучэнцаў: па 100 найлепшых прадстаўнікоў з шасці абласцей, сталіцы, а таксама выпускнікі навучальных устаноў Бабруйска і рэгіёна.**

— Гэтае мерапрыемства ўжо зарэкамендавала сябе як цікавая і новая форма правядзення апошняга званка, праўда, летась з-за пандэміі ад яго былі вымушаны адмовіцца, — расказала **кансультант галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі Ларыса ЕМЯЛЬЯНЧЫК.** — Падчас правядзення рэспубліканскага свята пройдуць цырымонія ўскладання кветак на плошчы Перамогі, урачыстая лінейка перад «Бабруйск-Арэнай», дзе будуць узнагароджаны найлепшыя выпускнікі ў намінацыях «Інтэлект», «Спорт», «Творчасць» і «Лідар». Гэта пераможцы міжнародных, рэспубліканскіх алімпіяд, спаборніцтваў, турніраў, тыя, хто паспяхова зарэкамендаваў сябе ў грамадскай працы, пераможцы розных творчых конкурсаў. Яны будуць узнагароджаны дыпломамі Міністэрства адукацыі і памятнымі сувенірамі. Пасля ўрачыстай лінейкі адбудзецца канцэртная праграма і маладзёжная дыскатэка ўжо непасрэдна ў «Бабруйск-Арэне».

Апошнія званкі ва ўсіх школах краіны Міністэрства адукацыі рэкамендуе правесці 29 мая, а выпускныя вечары — 10 чэрвеня.

СТАР. 7

ISSN 1990 — 763X

21096

# Адказнасць за словы і дзеянні

**Учора Прэзідэнт падпісаў тры законы. Усе яны датычацца ў тым ліку і нацыянальнай бяспекі.**

## Масавыя мерапрыемствы — толькі з дазволу мясцовых улад

У прыватнасці, падпісаны закон, якім уносяцца змены ў заканадаўства аб масавых мерапрыемствах.

Выключаецца паведамляльны парадак арганізацыі масавых мерапрыемстваў. Пасля ўступлення закона ў сілу ўсе масавыя мерапрыемствы павінны праводзіцца выключна на падставе дазволу мясцовых органаў.

Забараняецца збор, атрыманне і выкарыстанне грашовых сродкаў і іншай маёмасці, выкананне работ, аказанне паслуг для кампенсацыі выдаткаў, абумоўленых прыцягненнем да адказнасці за парушэнне.

Уводзіцца забарона асвятлення ў рэжыме рэальнага часу масавых мерапрыемстваў, якія праводзяцца з парушэннем устаноўленага парадку, з мэтамі іх папулярызацыі або прапаганды. Дадзеная забарона будзе распаўсюджвацца ў тым ліку на журналістаў сродкаў масавай інфармацыі.

Журналістам пры выкананні сваіх абавязкаў забараняецца выступаць у якасці арганізатараў ці ўдзельнікаў масавых мерапрыемстваў.

Мясцовыя органы і органы ўнутраных спраў надзяляюцца правам прыпыняць работу інфраструктуры (гандлёвых аб'ектаў, аб'ектаў грамадскага харчавання, транспарту, кірмашоў, арганізацый усіх формаў уласнасці) у месцах правядзення масавых мерапрыемстваў і па маршрутах перамяшчэння іх удзельнікаў.

Замацоўваецца адказнасць палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў за публічныя заклікі сваіх кіраўнікоў і членаў кіруючых органаў да арганізацыі і правядзення масавага мерапрыемства да атрымання дазволу на яго правядзенне.

Асноўныя палажэнні закона ўступаюць у сілу праз месяц пасля яго афіцыйнага апублікавання.

## Што трэба ведаць журналістам

Таксама падпісаны закон, якім карэкціруецца заканадаўства аб сродках масавай інфармацыі.

Пашыраецца пералік інфармацыі, распаўсюджванне якой у СМІ і на інтэрнэт-рэсурсах забаронена. У прыватнасці, уводзіцца забарона на размяшчэнне вынікаў апытанняў грамадскай думкі, якія адносяцца да грамадска-палітычнай сітуацыі, праведзеных без атрымання неабходнай акрэдытацыі. Таксама не дапускаецца размяшчэнне гіперспасылак на паведамленні і матэрыялы, якія змяшчаюць інфармацыю, распаўсюджванне якой забаронена.

Генеральнаму пракурору, пракурорам абласцей, горада Мінска даецца права абмяжоўваць доступ да інтэрнэт-рэсурсаў і сеткавых выданняў, праз якія распаўсюджваюцца звесткі, накіраваныя на прапаганду экстрэмісцкай дзейнасці або змяшчаюць заклікі да такой дзейнасці, а таксама іншая інфармацыя, распаўсюджванне якой здольна нанесці шкоду нацыянальным інтарэсам.

Выпадкі абмежавання доступу да інтэрнэт-рэсурсаў і спынення выпуску СМІ дапаўняюцца такой падставай, як прыняцце Міжведамаснай камісіяй па бяспецы ў інфармацыйнай сферы рашэння аб наяўнасці інфармацыйных паведамленняў, распаўсюджванне якіх здольна нанесці шкоду нацыянальным інтарэсам.

Устанаўліваецца, што разам з рашэннем суда выпуск СМІ можа быць спынены рашэннем Мінінфарма (напрыклад, у выпадку вынясення юрыдычнай асобе, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі СМІ, або заснавальніку СМІ, або ўладальніку сеткавага выдання двух і больш пісьмовых папярэджанняў).

Прадугледжваюцца меры, накіраваныя на мінімізацыю замежнага ўплыву на беларускі інфармацыйны рынак. Так, незалежна ад часу стварэння СМІ, іх заснавальнікамі не могуць выступаць замежныя юрыдычныя асобы, замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, а таксама юрыдычныя асобы з замежным удзелам.

Уводзіцца магчымасць пазбаўлення акрэдытацыі журналіста СМІ, калі ім або юрыдычнай асобай, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі СМІ, парушаны ўстаноўлены парадак акрэдытацыі або распаўсюджаны звесткі, якія не адпавядаюць рэчаіснасці і ганьбяць дзелавую рэпутацыю арганізацыі, якая акрэдытавала журналіста, альбо здзейснена наўмыснае супрацьпраўнае дзеянне ў працэсе прафесійнай дзейнасці.

Замацоўваецца магчымасць абмежавання доступу да копіі інтэрнэт-рэсурсу, доступ да якога раней быў абмежаваны.

Асноўныя палажэнні закона ўступаюць у сілу праз месяц пасля яго афіцыйнага апублікавання.

## Сеткі электрасувязі пад кантролем

Трэці падпісаны кіраўніком краіны нарматыўны дакумент — закон, якім уносяцца змены ў заканадаўства аб электрасувязі.

Дакументам прадугледжваецца, што ў мэтах папярэджання сітуацый, якія ствараюць пагрозу нацыянальнай бяспецы, дзяржавай могуць быць прыняты меры па абмежаванні функцыянавання сетак электрасувязі і якія ўваходзяць у іх сродкаў электрасувязі (скарачэнне часу і аб'ёмаў іх выкарыстання, змяненне рэжымаў работы), прыпыненне функцыянавання сетак электрасувязі і якія ўваходзяць у іх сродкаў электрасувязі (часовага спынення іх работы).

Пры гэтым устанаўліваецца, што паўнамоцтвы па кіраванні сеткай электрасувязі агульнага карыстання даюцца аператыўна-аналітычнаму цэнтру пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Невыкананне аператарамі электрасувязі патрабаванняў аб прыпыненні або абмежаванні функцыянавання сетак электрасувязі і якія ўваходзяць у іх сродкаў электрасувязі будзе з'яўляцца грубым парушэннем заканадаўства аб ліцэнзаванні дзейнасці ў галіне сувязі.

Закон уступае ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання.

**Паводле БелТА.**

### Каментарый у тэму

**Мікалай ШЧОКІН, кандыдат філасофскіх навук, загадчык аддзела сацыялогіі дзяржаўнага кіравання Інстытута сацыялогіі НАН:**

«У адпаведнасці з законам аб электрасувязі дзяржавай могуць быць прыняты меры па абмежаванні функцыянавання сетак электрасувязі і якія ўваходзяць у іх сродкаў электрасувязі. Лічу, што запатрабаванасць такога закона даўно наспела. Гаворка ідзе не толькі аб нацыянальнай бяспецы як такой, але і аб прадухіленні гібрыднага ўплыву на беларускае грамадства, асабліва на неакрэплыя душы маладога пакалення, з боку недружалюбных краін, мэтай якіх, як мы ўжо змаглі пераканацца, з'яўляецца гвалтоўнае звяржэнне ўлады і знішчэнне дзяржавы. Зараз мы нясём адказнасць перш за ўсё перад будучымі пакаленнямі. Аператыўна-аналітычнаму цэнтру пры Прэзідэнце аддадзена галаўная рэгулятыўная функцыя, што сведчыць аб комплекснай сістэматызацыі сваёй работы ў сферы нацыянальнай бяспекі — сацсеткі, сувязь, энергабяспека. Грамадства павінна быць упэўнена, што дзяржава пры любой надзвычайнай сітуацыі ў краіне зможа забяспечыць недатыкальнасць асабістага жыцця. Такім чынам, дзяржава эвалюцыйна рухаецца па шляху ўмацавання абароны свайго суверэнітэту і незалежнасці».

Кажучы пра ролю закона для знешняга контуру краіны, Мікалай Шчокін падкрэсліў, што дакумент становіцца перашкодай укараненню такіх фондаў, як Фонд падтрымкі дэмакратыі (NED, ЗША) і многіх іншых, накіраваных на дэструктыўны ўплыў у грамадстве.

«Навацыі ў законах аб СМІ і масавых мерапрыемствах уведзены з улікам сусветнага вопыту. Практычна ўсе інавацыйныя палажэнні ўжо ўкаранёны і рэалізоўваюцца ва ўсіх краінах калектыўнага Захаду. У ім выразна арганізацыйна-функцыянальна прапісаны механізмы і прынцыпы правядзення масавых мерапрыемстваў. У сувязі з гэтым важным з'яўляецца змяненне ў часткі надзялення дадатковым правам мясцовых органаў і органаў унутраных спраў рэгуляваць правядзенне масавых мерапрыемстваў з агульнай каардынацыяй работы гандлёвай інфраструктуры, — разважае аналітык. — Галоўная мэта закона аб СМІ — мінімізацыя замежнага ўплыву на беларускі інфармацыйны рынак, абмежаванне доступу да інтэрнэт-рэсурсаў пры наяўнасці ў іх інфармацыі, распаўсюджванне якой можа нанесці шкоду нацыянальным інтарэсам».

Па словах Мікалая Шчокіна, закон аб СМІ ўстанаўлівае выразныя правілы гульні ў інфармпрасторы, блакіруючы інфармацыйны рэгуляваны хаос, за якім стаіць прапаганда экстрэмісцкай дзейнасці і ідэалогіі нацызму.

«Лічу, што важным пунктам з'яўляецца ўвядзенне забароны на публікацыю вынікаў апытанняў, якія адносяцца да грамадска-палітычнай сітуацыі, праведзеных без атрымання неабходнай акрэдытацыі. Дзяржава павінна навучыцца сябе абараняць і ствараць свой парадак дня. За ўсімі гэтымі зменамі прасочваецца імкненне захаваць грамадзянскі мір, гістарычную праўду і традыцыйныя каштоўнасці», — адзначыў эксперт.

Блізкая ўлада

# РАМОНТ ЖЫЛЛЯ, ТРАНСПАРТ, СВАБОДНЫ ЧАС ДЛЯ ПАДЛЕТКАЎ

## Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА правёў прамую лінію

**На прамую тэлефонную лінію, якую правёў старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА ў мінулую суботу, дазваніліся 32 жыхары вобласці. Пытанні, якія задавалі людзі, датычылі розных сфер жыцця. Найбольш праблем, як заўсёды, узнімалася наконт дарог, жыллёва-камунальных адносін, работы транспарту.**



Ніна Міхайлаўна, 80-гадовая брастаўчанка, мае дачны ўчастак паміж вёскамі Чэрні і Тэльмы. Раней туды хадзіла маршрутка 11-га нумара. Цяпер яе няма. «Моладзь ездзіць машынамі, — гаварыла пенсіянерка — а мы, людзі сталага веку, павінны пераадольваць значную адлегласць пехатою. Няўжо нельга арганізаваць адзін з маршрутаў гарадскога транспарту, каб аўтобус хадзіў хоць бы ранкам і ўвечары?»

Губернатар звязаўся са службовай асобай, якая курыруе транспарт, і атрымаў тлумачэнне, што прыпыначны пункт, які просяць устанавіць дачнікі, прымыкае да аўтастрады, а гэта забаронена правіламі бяспекі. Але кіраўніка вобласці адказ не задаволіў, і ён даручыў неадкладна сустрэцца з людзьмі і выпрацаваць альтэрнатыўны варыянт прыпынку.

А што перашкодзіла ўстанавіць прыпынак па вуліцы Гаўрылава ў Брэсце, засталося незразумелым. Рэч у тым, што ў снежні мінулага года вецер перавярнуў названы прыпынак, канструкцыі часткова ўпалі на людзей. Тады пашкоджаны прыпынак прыбралі, але неаднавілі яго да гэтай пары. Старшыня аблвыканкама паабяцаў гараджанцы, якая званіла, што ў хуткім часе дарожнікі ўсё выправяць.

Жыльцы аднаго з пад'ездаў дома па вуліцы Чкалава ў Ляхавічах паскардзіліся на якасць капітальнага рамонту. Па-першае, падчас яго ніхто не зважаў па дождж, і людзей літаральна залівала. Залівае і цяпер, калі рамонт даху наблізіўся да завяршэння. На гэты зварот кіраўнік вобласці адказаў так: «Да вас тэрмінова выедзе старшыня райвыканкама і разбярэцца на месцы».

Брастаўчанка прапанавала адкрыць у горадзе дзяржаўны інфармацыйна-забаўляльны цэнтр для падлеткаў. Юрый Шулейка адзначыў, што гэтая ідэя заслугоўвае ўвагі, і паабяцаў усебакова вывучыць прапанову.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## 14 чалавек загінула пры аварыі фунікулёраў Італіі



Чатырнаццаць чалавек загінула ў выніку аварыі кабіны фунікулёра ў італьянскім рэгіёне П'емонт каля Лага-Маджорэ і гары Матаронэ. Інцыдэнт адбыўся каля апошняй апоры канатнай дарогі, прыкладна за трыста метраў ад вяршыні гары вышынёй 1490 метраў над узроўнем мора.

Паводле папярэдняй версіі, прычынай аварыі стаў трос, які выйшаў са строю, паведамляе DW. Пры надзвычайным здарэнні павінны былі спрацаваць механізмы, якія затармажваюць падзенне кабіны, аднак гэтага не адбылося.

Ахвяры — члены пяці сем'яў, у іх ліку двое дзяцей. Мэр суседняга горада Стрэза Марсела Северына расказаў Sky News, што, відаць па ўсім, трос абарваўся, машына пахіснулася, стукнулася аб пілон і ўпала на зямлю, перавярнуўшыся два ці тры разы, перш чым ударылася аб дрэвы. Як мяркуецца, кабінка ўпала прыкладна з вышыні 15 метраў, некаторых з загінулых выкінула з кабіны.

## Кошт біткоіна абваліўся амаль напалову



Кошт самай папулярнай крыптавалюты — біткоіна — абваліўся амаль напалову ў параўнанні з гадавым максімумам, адзначае Reuters.

У нядзелю, 23 мая, біткоін страціў адразу 13 працэнтаў на фоне агульнага распродажу крыптавалют. Да раніцы панядзелка ён змог трохі адыграць падзенне і цяпер каштуе 36,404 тысячы долараў за манету.

«Сапраўды, біткоін здзяйсняе сур'ёзныя і галавакружныя ваганні», — канстатавала эксперт інвестыцыйнага банка RBC Capital Markets Эмі Ву.

## У Расіі выявілі 154 нявывучаныя мутацыі каранавіруса

У Расіі выявілі 154 мутацыі каранавіруса, якія трэба будзе вывучыць у далейшым. Пра гэта заявіў дырэктар Цэнтральнага навукова-даследчага інстытута эпідэміялогіі Расспажыўнагляда Васіль Акімкін, піша «Інтэрфакс».

«Выяўлена больш за 1000 узораў штамаў з вядомымі мутацыямі, якія зарэгістраваны ў базах даных, выяўлена таксама больш за 150 узораў з наяўнасцю важных мутацый, у тым ліку і такіх, якія раней не апісаны, але патрабуюць далейшага вывучэння», — сказаў Акімкін.

Паводле яго слоў, у інстытут паступіла 16 тысяч узораў з 82 рэгіёнаў і краін СНД. Ужо было праведзена 12 тысяч даследаванняў.

За апошнія суткі ў Расіі было выяўлена 8 406 новых выпадкаў каранавіруснай інфекцыі, памерла за суткі 319 пацыентаў.

# «ЦЫНІЧНАЕ ЗНЕВАЖАННЕ МІЖНАРОДНАГА ПРАВА»

## Рэакцыя афіцыйнага Мінска на інцыдэнт са сцягам у Рызе — жорсткая, але зразумелая

**Учора ў сталіцы Латвіі адбылася без перабольшвання палітычная правакацыя. У Рызе, дзе гэтымі днямі праходзіць чэмпіянат свету па хакеі, у цэнтры горада ўстаноўлены сцягі краін — удзельніц турніру. Учора мэр Рыгі Марціньш Стакіс і міністр замежных спраў Латвіі Эдгар Рынкевіч замянілі дзяржаўны сцяг Беларусі на бел-чырвона-белую сімволіку.**

**Адказ афіцыйнага Мінска быў хуткі і катэгарычны. Міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір МАКЕЙ назваў актам дзяржаўнага вандалізму інцыдэнт з дзяржсцягам Беларусі ў Рызе. Пра гэта ён заявіў журналістам пасля таго, як у МЗС быў запрошаны пасол Латвіі ў Беларусі Эйнарс Семаніс, паведамляе БелТА.**

«Паслу быў заяўлены рашучы пратэст у сувязі з гэтай сітуацыяй, у сувязі з гэтым інцыдэнтам. Было выразна даведзена, што гэта з'яўляецца цынічным зневажаннем усіх нормаў міжнароднага права, фактычна актам дзяржаўнага вандалізму. Для нас абсалютна непрымальныя падобныя дзеянні, накіраваныя супраць суверэннай дзяржавы і суверэннай нацыі. Гэта пры тым, што нашы партнёры заяўляюць пра нібыта ўсебаковую падтрымку нашай дзяржаўнасці, нашага суверэнітэту і незалежнасці. А на самай справе здзяйсняюць адкрытыя правакацыі, якія накіраваны на разбурэнне гэтага суверэнітэту і дзяржаўнасці».

«Ад латвійскага боку запатрабавана правесці расследаванне. Прынесці прабачэнні і вярнуць на месца Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь. Паслу ўручана адпаведная нота пратэсту. Мы не можам пакінуць падобнага роду правакацыйныя дзеянні без адказу», — сказаў міністр.

«Паслу прапанавана пакінуць Беларусь на працягу 24 гадзін. Усяму дыпламатычнаму і адміністрацыйна-тэхнічнаму складу пасольства таксама прапанавана пакінуць Беларусь — на працягу 48 гадзін. Пакінуць тут аднаго адміністрацыйна-тэхнічнага супрацоўніка для догляду за будынкам», — паведаміў міністр. «Напэўна латвійскі бок адкажа сіметрычна. Мы гатовыя да гэтага. Але на дадзеным этапе, у дадзенай сітуацыі мы не бачым магчымасці працаваць з цяперашнім складам дыппрадстаўніцтва», — сказаў Уладзімір Макей. «Мы не можам пакінуць падобнага роду правакацыйныя дзеянні без адказу», — падкрэсліў ён.

«Нас здзіўляе, што падобнага роду дзеянні здзяйсняюцца на фоне заяў Беларусі пра гатоўнасць правесці транспарэнтнае адкрытае расследаванне інцыдэнту з самалётам Ryanair з удзелам міжнародных экспертаў. На гэтым фоне робіцца не проста нейкія палітычныя заявы ў адрас Беларусі, якія абвінавачваюць, але і робіцца канкрэтныя дзеянні, правакацыі», — дадаў кіраўнік МЗС.

Спланаванай правакацыяй назваў міністр і рэакцыю палітыкаў заходніх краін на сітуацыю з самалётам Ryanair. «Ці не спецыялісты, падкрэсліваю, а палітычныя дзядзькі і цёткі на Захадзе, якія валодаюць уладай, уладнымі рычагамі, літаральна на працягу 10—15 хвілін пасля атрымання інфармацыі пра гэты інцыдэнт з самалётам ужо пачалі рабіць адпаведныя палітычныя заявы. Натуральна, з абвінавачваннямі ў адрас Беларусі. Гэта не можа не насцярожваць, і мы разглядаем гэта як спланаваныя, скаардынаваныя дзеянні і спланаваную правакацыю. Таму, натуральна, мы будзем адказваць на падобнага роду рэчы. Мы не зацікаўлены ў нагнятанні сітуацыі, абстаноўкі. Шмат разоў падкрэслівалася і гаварылася пра тое, што Беларусь зацікаўлена ў тым, каб развіваць нармальныя адносіны з усімі дзяржавамі, уключаючы Латвію і іншых суседзяў. Але калі аб Беларусі і яе народ будуць спрабаваць выцерці ногі, то такія дзеянні не могуць і не павінны заставацца без адказу. Менавіта таму сёння пасол Латвіі быў запрошаны ў МЗС і яму былі зроблены адпаведныя прапановы», — сказаў Уладзімір Макей.

Пры гэтым міністр заявіў, што Беларусь гатова запрасіць міжнародных экспертаў у сувязі з пасадкай самалёта Ryanair у Мінску. Ён таксама заявіў пра гатоўнасць беларускага боку даць любыя звесткі, звязаныя з інцыдэнтам. «Гатовыя транспарэнтна праводзіць расследаванне гэтага інцыдэнту з удзелам у тым ліку адпаведных міжнародных спецыялістаў. Але ні адна краіна Еўрасаюза, ні адна заходняя краіна не запытала інфармацыю на гэты конт ад беларускага боку, наколькі мне вядома на дадзены момант. Але затое паспелі зрабіць ужо, напэўна, сотні палітычных заяў не толькі з абвінавачваннямі, але і адкрытымі пагрозамі ў адрас Беларусі. Вось гэта абсалютна недапушчальна. Гэта тое, што называецца «новы геапалітычны парадак у дзеянні», — падкрэсліў Уладзімір Макей.

### ❍ У тэму

**Кіраўнік Федэрацыі хакея Беларусі Дзмітрый БАСКАЎ пракаментаваў інцыдэнт з заменай Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь у сталіцы Латвіі, дзе праходзіць чэмпіянат свету па хакеі, паведамілі ў прэс-службе федэрацыі.**

«Федэрацыя хакея Беларусі лічыць жэст рыжскай адміністрацыі актам глыбокай непавагі і беспрэцэдэнтнага ціску ў адносінах да спартсменаў, якія прадстаўляюць нашу краіну на чэмпіянаце свету па хакеі — 2021. Як мы неаднаразова падкрэслівалі раней, наша каманда паехала на турнір, каб даказаць моц нашай краіны на спартыўнай пляцоўцы, а не з палітычнай трыбуны, на якую ўсяляк спрабавалі яе зацягнуць яшчэ ў перыяд падрыхтоўкі да сумеснага з Латвіяй правядзення чэмпіянату. Мы глыбока абураныя, што ў адсутнасць палітычнага інструментарыя прадстаўнікі замежных дзяржаў лічаць магчымым зрабіць спорт пляцоўкай палітычных разбіральніцтваў», — сказаў Дзмітрый Баскаў.

ФХБ ужо накіравала афіцыйную ноту на адрас прэзідэнта Міжнароднай федэрацыі хакея Рэнэ Фазеля, аргкамітэта чэмпіянату свету ў Рызе і кіраўніцтва Федэрацыі хакея Латвіі. Па словах кіраўніка ФХБ, замена дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь у пуле сцягоў краін — удзельніц турніру і афіцыйных сімвалаў чэмпіянату з'яўляецца нічым іншым як спробай палітызаваць сусветны хакейны форум у Рызе і прама супярэчыць спартыўнаму характару чэмпіянату.

«Нам таксама вядома аб несанкцыянаваных пікетах у месцах знаходжання нашай каманды. Усе гэтыя факты прама парушаюць кодэкс паводзін IIХФ, якім павінны кіравацца і краіны — арганізатары турніраў пад эгідай Міжнароднай федэрацыі хакея. Таму зараз мы ўсур'ёз занепакоены бяспекай нашых гульцоў у Рызе і спадзяёмся, што IIХФ зможа забяспечыць не толькі дадатковыя меры абароны каманды ад знешняга ціску, але і выкананне ўласных нарматыўных актаў», — рэзюмаваў Дзмітрый Баскаў.

# ЭКСТРАННАЯ ПАСАДКА

**Інцыдэнт, які стаў галоўнай навіной мінулых выхадных, — самалёт авіякампаніі «Ryanair», які ляцеў па маршруце Афіны — Вільнюс, запытаў экстранную пасадку ў Мінску. Экіпаж паветранага судна паведаміў аб замініраванні самалёта. Аб гэтым было неадкладна далажана Прэзідэнту Беларусі. Каманду прыняць самалёт у Нацыянальным аэрапорце «Мінск» даў асабіста ён. Акрамя таго, па даручэнні Аляксандра Лукашэнкі, для суправаджэння пасажырскага самалёта са 123 пасажырамі на борце ў неба быў падняты знішчальнік МіГ-29. Пасля завяршэння неабходных праверачных мерапрыемстваў у мінскім аэрапорце самалёт узляцеў і паспяхова прызямліўся ў аэрапорце прылёту.**

**Сітуацыя не зусім штатная. Але менавіта так дзейнічала б любая міралюбівая краіна — дапамагчы мірным людзям, жыццё якіх магло раптоўна абарвацца. І абсалютна няважна, адкуль і куды яны ляцелі. Калі быў пададзены сігнал бедства (а ў дадзеным выпадку камандзір паветранага судна запытаў пасадку ў Мінску), усе палітычныя пытанні павінны адыходзіць на другі план. На жаль, гэтым прынцыпам кіруюцца не ўсе, і выпадак з самалётам стаў прадметам палітычных спекуляцый. Як яно было на самай справе і якія высновы можна зрабіць з сітуацыі, карэспандэнты «Звязды» высвятлялі ў спецыялістаў.**

**Начальнік Дэпартамента па авіяцыі Міністэрства транспарту і камунікацый Арцём СІКОРСКІ:**

— 23 мая на электронную пошту Нацыянальнага аэрапорта Мінск з электроннага адраса з даменам com паступіла пісьмовае паведамленне на англійскай мове з пагрозамі, што бомба, закладзеная ў дадзеным авіялайнеры, узарвецца 23 мая над Вільнюсам. З улікам дадзенай пагрозы інфармацыя з Нацыянальнага аэрапорта Мінск была перададзена ў адпаведныя органы. У адпаведнасці з Чыкагскай канвенцыяй, а таксама з патрабаваннямі Нацыянальнай праграмы аб абароне грамадзянскай авіяцыі ад актаў незаконнага ўмяшання, быў прыведзены ў дзеянне механізм дзеянняў у сувязі з актам незаконнага ўмяшання ў справы грамадзянскай авіяцыі.

Уваход у паветраную прастору Беларусі паветранага судна, якое рушыла па маршруце Афіны — Вільнюс, адбыўся ў 12.30 па мінскім часе. Пасля ўстанаўлення сувязі паміж беларускім дыспетчарам і экіпажам паветранага судна адрасу была даведзена інфармацыя аб пагрозе, якая паступіла. Экіпаж мог прыняць рашэнне вярнуцца ў Львоў, Кіеў, сесці ў Варшаве, працягнуць палёт да Вільнюса. У 12.34 дыспетчарам было прапанавана скарыстацца магчымасцю пасадкі ў аэрапорце Мінск. Пасля ўдакладнення інфармацыі экіпаж рэйса 4988 у адпаведнасці з міжнароднымі патрабаваннямі ў 12.47 устанавіў на борце самалёта код адказчыка 7700, які ўказвае на наяўнасць аварыйнай сітуацыі і ў радыётэлефонным рэжыме запытаў дапамогі фразай Mayday, пасля чаго экіпаж паведаміў, што прыняў рашэнне ажыццявіць пасадку ў Нацыянальным аэрапорце Мінск. Ціску на прыняцце рашэння з боку беларускіх дыспетчараў не было. Пасадка самалёта была паспяхова ажыццёўлена ў 13.15, пасля чаго, у адпаведнасці з патрабаваннямі авіяцыйнай бяспекі, самалёт быў адпраўлены на спецыяльную ізаляваную стаянку. Пасля заканчэння адпаведных праверак у 16.20 паветранаму судну было прапанавана вылецець. У 20.49 адбыўся вылет. Па папярэдніх ацэнках Дэпартамента па авіяцыі, экіпаж паветранага судна дзейнічаў у межах міжнародных прынцыпаў грамадзянскай авіяцыі.

**Камандуючы Ваенна-паветранымі сіламі і войскамі проціпаветранай абароны Узброеных Сіл Ігар ГОЛУБ:**

— Каманда Mayday аператыўнаму дзяжурнаму паступіла ў 12.48. Пасля мной было прынята рашэнне ў 12.58 даць дзяжурнаму экіпажу каманду «Паветра». Дзяжурны экіпаж выканаў узлёт у 13.04. У гэты час паветранае судна ўжо знаходзілася ў раёне населенага пункта Стоўбцы. Ні аб якім ранейшым папярэджанні аб вяртанні паветранага судна ў Нацыянальны аэрапорт Мінск не было. У 13.18 мы атрымалі інфармацыю ад дыспетчара «Мінск-2», што экіпаж ажыццявіў паспяховую пасадку. Таму казаць аб тым, што дзяжурным экіпажам быў спынены палёт дадзенага судна, непраўмерна.

**Намеснік генеральнага дырэктара па бяспецы, рэжыму і кадрах Нацыянальнага аэрапорта Мінск Сяргей ШЫЧКО:**

— Пасля таго, як паступіла інфармацыя аб тым, што да нас у экстранным парадку садзіцца борт авіякампаніі Ryanair, было прынята рашэнне дзейнічаць у адпаведнасці з нарматыўнымі дакументамі, якія прыняты ў Рэспубліцы Беларусь. У рамках гэтых дакументаў мы выканалі наступныя дзеянні. Як толькі атрымалі інфармацыю пра тое, што борт будзе садзіцца аварыйна, былі сабраны разлікі аварыйна-ратавальнай каманды, якая знаходзіцца ў аэрапорце, адбылося апавяшчэнне ўсіх зацікаўленых структур. Пры прыбыцці борта ў адпаведнасці з адпрацаванай практыкай рэагавання на падобнага кшталту інцыдэнты паветранае судна было размешчана на спецыяльнай стаянцы і ўзята пад ахову нашымі супрацоўнікамі атрада ваенізаванай аховы. Падагналі трапы, і пачалася высадка пасажыраў з ручной паклажай. Супрацоўнікі кіналагічнага падраздзялення службы авіяцыйнай бяспекі аэрапорта пачалі яе дагляд, паралельна прыбылі спецыялісты Выбухатэхнічнага цэнтра ўнутраных войскаў Міністэрства ўнутраных спраў. Быў праведзены спецыяльны агляд паветранага судна для праверкі яго на наяўнасць магчымага выбуховага прыстасавання. Пасля гэтага пасажыры і члены экіпажа аўтобусамі былі дастаўлены ў сектар пералёту міжнародных рэйсаў і на пункт нагляду транзітных пасажыраў для паўторнага перадпалётнага нагляду. Паралельна з дастаўкай пасажыраў пачалася выгрузка асноўнага багажу. З пасажырамі працавалі прадстаўнікі пагранічнай службы краіны. Багаж з-пад борта для дадатковай праверкі быў дастаўлены ў багажнае аддзяленне нашага аэрапорта, агляд праводзіўся пры дапамозе спецыяльных сродкаў — інтраскопаў. Да 16 гадзін быў перадпалётны дагляд інспектарамі па даглядзе службы авіяцыйнай бяспекі пасажыраў, іх ручной паклажы і членаў экіпажа ў пункце нагляду для таго, каб пасажыраў накіраваць на борт паветранага судна і рыхтаваць іх да вылету.

**Старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Андрэй САВІНЫХ:**

— Лічу бессэнсоўнай нервовую рэакцыю заходніх палітыкаў і СМІ з нагоды пасадкі ў Мінску самалёта, у дачыненні да якога паступіла паведамленне аб мініраванні. Рашэнне пра аварыйную пасадку прымае выключна камандзір экіпажа, ён дзейнічае заўсёды згодна з інструкцыяй, зацверджанай Міжнароднай арганізацыяй па грамадзянскай авіяцыі. Упэўнены, што і ў гэтым выпадку дзеянні экіпажа былі прадыктаваны выключна выкананнем сваіх абавязкаў. Тое, што адзін з пасажыраў паветранага судна, які знаходзіцца ў крымінальным вышуку Беларусі, быў адпаведным чынам затрыманы, калі апынуўся ў зоне беларускай юрысдыкцыі, лічу супадзеннем. Вядома, што афіцыйныя ўлады Беларусі заўсёды дзейнічаюць строга ў рамках прававога поля, у адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам, якое, дарэчы, у частцы арышту і правядзення следчых дзеянняў у поўнай меры адпавядае ўсім нормам міжнароднага права. Але гэтае натуральнае рэагаванне беларускай праваахоўнай сістэмы і выклікала вельмі нервовую рэакцыю істотнай колькасці заходніх структур. Гэта зразумела: затрыманы грамадзянін мае прамое дачыненне да арганізацыі работы інфармацыйных каналаў, якія, па сутнасці, ігралі ключавую ролю ў каардынацыі дзеянняў пры спробе дэстабілізацыі абстаноўкі ў краіне ў жніўні мінулага года, захопу ўлады, здзяйснення дзяржперавароту ў Беларусі. Гэты выпадак — найбуйнейшая «ўцечка інфармацыі» аб фінансаванні замежнымі структурамі дэструктыўных інфармканалаў і каардынацыйнай дзейнасці змоўшчыкаў аб тым, якія са спецслужбаў замежных краін прымалі ўдзел, на якія парушэнні міжнароднага заканадаўства былі гатовыя пайсці, каб дабіцца задуманага. І гэта, з майго пункту гледжання, і тлумачыць такую нервовую рэакцыю, у тым ліку і высокапастаўленых еўрапейскіх чыноўнікаў. Гэта тлумачыць і з'яўленне вялікай колькасці спекуляцый, якімі імкнуцца ў цяперашні час запоўніць інтэрнэтпрастору. Але, як кажуць, позна піць баржомі...

Лічу, што цяпер беларускім экспертам патрэбна даступна данесці сэнс «палітычных танцаў» вакол гэтай сітуацыі, каб сфарміраваць адэкватнае разуменне ў простых грамадзян таго, што ў рэальнасці адбываецца.

# РУБЕЛЬ УМАЦОЎВАЕЦЦА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На думку фінансавага аналітыка Дзмітрыя Нарывончыка, галоўная прычына апераджальнага росту экспарту — павелічэнне вартасных аб'ёмаў сыравіннага складніка. Бо з 880 млн долараў прыросту экспарту 620 млн USD прыйшліся на ключавыя напрамкі сыравіннага экспарту — перапрацоўку расійскай нафты і продаж калійных угнаенняў. Уклад ад рэалізацыі беларускай прадукцыі несыравіннага характару ў прырост экспарту не перавышае 260 млн USD.

**«У цэлым дзякуючы нармалізацыі сітуацыі з банкаўскімі ўкладамі ўдалося пазбегнуць залішняга попыту на замежную валюту, які можна было назіраць летась».**

Парк высокіх тэхналогій не паддаўся на хітрыкі інфармацыйнага прэсінгу і спрацаваў досыць прыбыткова. І нават нягледзячы на прагназаваны адток спецыялістаў сферы інфармацыйных тэхналогій, станоўчае сальда знешняга гандлю IT-паслугамі не знізілася. Толькі за два першыя месяцы года ў скарбонку краіны ўдалося пакласці 668,1 млн долараў (у студзені-лютым 2020 года — 641,8 млн USD).

Гэтыя даныя сведчаць аб тым, што грашовы паток ад знешняга гандлю працягвае заставацца станоўчым, нягледзячы на прынятыя ў дачыненні да нашай краіны санкцыі.

## ПРАДАЮЦЬ БОЛЬШ, ЧЫМ КУПЛЯЮЦЬ

Статыстыка па валютным рынку за студзень—красавік гэтага года дэманструе, што суб'екты гаспадарання, нерэзідэнты і банкі сталі чыстымі прадаўцамі замежных грашовых адзінак з перавышэннем аб'ёму прададзенай валюты над набытай. За разгледжаны намі перыяд яны прадалі на 420,6 млн долараў больш, чым купілі. У мінулым годзе юрыдычныя асобы дэманстравалі павышаны попыт на валюту і за такі ж перыяд купілі яе на 759,4 млн долараў больш, чым прадалі. Ва ўмовах, калі курс долара рос па некалькі капеек у дзень, «уцёкі ў валюту» былі натуральным жаданнем прадпрымальнікаў захаваць заробленае.

Цяпер сітуацыя адваротная. У гэты час умацаванне беларускага рубля прыносіць страты тым, чые звычайныя гаспадарчыя аперацыі здзяйсняюцца ў рублях, а свабодныя сродкі захоўваюцца ў валюце. Гэта прыводзіць да таго, што яшчэ большая частка «юрыкаў» пачынаюць прадаваць свае «зялёныя» запасы на біржавых таргах.

А вось вялікая частка насельніцтва да мясцовай валюты ставіцца скептычна. Менавіта фізічныя асобы па-ранейшаму працягваюць заставацца чыстым пакупнікамі валюты: яны за чатыры месяцы набылі на 349 млн долараў больш, чым прадалі. У той жа час у параўнанні з мінулым годам перавышэнне попыту над прапановай істотна меншае. Бо летась у студзені-красавіку адмоўнае сальда па валюце дасягала 521,3 млн долараў.

**Што мы маем у актыве? Па выніках першых чатырох месяцаў прапанова на валютным рынку перавысіла попыт, што садзейнічала ўмацаванню курсу беларускага рубля і дазволіла Нацыянальнаму банку стаць чыстым пакупніком валюты. А гэта прывяло да своечасовага назапашвання Нацбанкам золатавалютных рэзерваў належных аб'ёмаў.**

## БАНКАЎСКІЯ ЎКЛАДЫ: ТЭНДЭНЦЫІ МЯНЯЮЦЦА

Яшчэ адным фактарам, які аказаў падтрымку валютнаму рынку, стала скарачэнне адтоку сродкаў з дэпазітаў. Паводле звестак аб стане шырокай грашовай масы, агульны аб'ём сродкаў у нацыянальнай валюце, размешчаных у дэпазітах, з 1 студзеня да 1 мая гэтага года скараціўся з 9180,7 млн рублёў да 8935,1 млн рублёў. Галоўная прычына — скарачэнне сродкаў юрыдычных асоб, што можа быць звязана з перыядам выплаты квартальных падаткаў.

Нам больш цікавы наступны паказчык. Дэпазіты фізічных асоб паказалі рост — з 4532,6 млн да 4655,7 млн рублёў (+2,7 %). Гэта яшчэ раз пацвярджае, што вострая стадыя крызісу ліквіднасці мінула, і зараз галоўная задача банкаў — збалансаваць даходнасць крэдытнага партфеля і кошт грашовых рэсурсаў. Аналагічна нізкія тэмпы скарачэння назіраюцца па дэпазітах у замежнай валюце.

У цэлым дзякуючы нармалізацыі сітуацыі з банкаўскімі ўкладамі ўдалося пазбегнуць залішняга попыту на замежную валюту, які можна было назіраць летась, калі насельніцтва масава забірала з банкаў беларускія рублі і купляла замежныя грошы.

## ПА ДАЎГАХ ПЛАЦІМ МЕНШ...

Яшчэ адным фактарам, які спрыяе скарачэнню адтоку валюты з краіны, стала часовая перадышка ў абслугоўванні дзяржаўнага доўгу. Паводле прэс-рэліза Нацбанка па стане золатавалютных рэзерваў на 1 мая гэтага года, у красавіку на выкананне ўнутраных і знешніх абавязацельстваў у замежнай валюце было накіравана 105 млн долараў. Але ў студзені мы плацілі па даўгах 410,6 млн долараў, у лютым — 250 млн долараў, а ў сакавіку — 310 млн USD.

У кароткатэрміновай перспектыве (да канца II квартала гэтага года) чакаецца паступленне другога траншу расійскага крэдыту ў памеры 500 млн долараў, што таксама акажа падтрымку ўнутранаму валютнаму рынку. Акрамя таго, Беларусь рыхтуецца да размяшчэння дзяржаўных аблігацый на расійскім рынку. Гэта вынікае з падпісанняў Указа ад 13.05.2021 № 183 «Аб прыцягненні знешніх дзяржаўных пазык». Запланаваны аб'ём эмісіі складае 100 млрд расійскіх рублёў, што эквівалентна 1,35 млрд долараў, а тэрмін звароту — тры гады.

## І ЯШЧЭ

Гэта ўжо шосты тыдзень запар умацавання беларускага рубля да валютнага кошыка, заявіў старшы аналітык кампаніі «Альпары Еўразія» Вадзім Іосуб. Аналітык не выключае, што ў хуткім часе долар можа знізіцца да 2,5 беларускага рубля, еўра застанецца каля 3,06 беларускага рубля, а расійскі рубель можа патаннець да 3,39 беларускага рубля за 100 расійскіх.

Дарэчы, пры ўсталяванні курсаў валют банкі ўлічваюць многія фактары, і адзін з іх — попыт, таму актуальны курс лепш удакладняць загадзя. Ён можа мяняцца як на працягу дня, так і ў выхадныя. Нялішнім будзе загадзя спытаць і пра наяўнасць валюты ў абменніках банкаў. Поспеху вам.

**Сяргей КУРКАЧ.**

---

Клопат

# Побач не толькі на святы

## Чырвоны Крыж удзяляе асаблівую ўвагу ветэранам

**У маі стартаваў месячнік Чырвонага Крыжа, прымеркаваны да стагоддзя арганізацыі. Падчас яго праходзяць розныя піяр-кампаніі: урачыстае віншаванне медыцынскіх сясцёр міласэрнасці, інфармацыйныя і фандрэзінгавыя акцыі (дзейнасць па зборы сродкаў) да дня сям'і, дня абароны дзяцей, дня прафілактыкі тытунекурэння. І, канешне, асаблівую ўвагу аддадуць нашым ветэранам Вялікай Айчыннай вайны. Клопат пра іх не заканчваецца са святамі, прысвечанымі Дню Перамогі. Адным з цікавых праектаў стала акцыя «Равеснік Беларускага Чырвонага Крыжа».**





На працягу месяца супрацоўнікі і валанцёры гарадскіх і раённых арганізацый Беларускага Чырвонага Крыжа наведаюць і павіншуюць пажылых людзей, якім ужо пад сто гадоў. З моманту старту акцыі, напрыклад, на Брэстчыне ўжо павіншавалі дзевяць імяніннікаў — у Баранавічах, Кобрыне Брэсце, Іванаве і Маларыце. Безумоўна, акрамя падарункаў, юбіляры пачулі шмат слоў падзякі, у тым ліку і за мірнае неба, за мужнасць і любоў да жыцця.

Для Марыі Паўлаўны Ткачовай, якой днямі споўнілася сто гадоў, прыход гасцей стаў сапраўдным сюрпрызам. Жанчына прыняла іх з радасцю, расказала пра свой няпросты лёс: як перажыла голад першых дзесяцігоддзяў пасля рэвалюцыі, блакаду Ленінграда, дзе яна адна з усёй сям'і выжыла, як скончылася вайна, і таму Дзень Вялікай Перамогі для яе значыць не менш, чым такая юбілейная дата. Жыццё працягваецца, і жанчына па-ранейшаму любіць чытаць кнігі і вырошчваць кветкі. Цяпер час ад часу дапамагае дачцэ сачыць за невялікім агародам.

Старшыня Баранавіцкай арганізацыі Беларускага Чырвонага Крыжа Людміла Шубіч уручыла імяніннікам кветкі і падарунак ад Чырвонага Крыжа і пажадала здароўя і бадзёрасці духу, шчыра падзякавала за шматгадовую працу, багаты жыццёвы вопыт і жыццёвую мудрасць.

Прадстаўнікі з Чырвонага Крыжа пачуюць яшчэ не адну кранальную гісторыю жыцця падчас акцыі. Але ж гэты праект не адзіная магчымасць размаўляць з людзьмі, на долю якіх выпала перажыць вайну. Супрацоўнікі і валанцёры дапамагаюць ветэранам справіцца са штодзённымі справамі і бытам: дапамагаюць прыбіраць, рабіць пакупкі, аплачваюць квітанцыі, аддаюць неабходнае ў рамонт. Сёстры міласэрнасці клапоцяцца пра тых, каму неабходны медыцынскі догляд дома. Ім важна, каб нашы ветэраны не заставаліся адзінокімі, адчувалі клопат і заўсёды ведалі, што Чырвоны Крыж побач і ў будні, і ў святы.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

---

Надвор'е

# ДАЖДЖОМ І НАВАЛЬНІЦАМІ «ПРАСЛАВІЎСЯ» СЁЛЕТНІ МАЙ...

## Нас чакае яшчэ адзін мокры тыдзень

**Да канца мая застаўся роўна тыдзень, але паводле папярэдняга прагнозу ўжо відаць, што ў метэаралагічным летапісе ён застанецца адносна халодным. Але больш за ўсё апошні месяц вясны расшчодрыўся на ападкі. Дажджы і навальніцы чакаюцца ў нашай краіне і на гэтым тыдні, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**



Атмасферныя франты, якія рухаюцца ў бок суседніх раёнаў Расіі, будуць вызначаць надвор'е на нашай тэрыторыі ў сераду. Будзе шмат аблокаў. На большай частцы нашай краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, уначы і раніцай у асобных раёнах ёсць верагоднасць дажджоў моцных. Месцамі прагрымяць навальніцы. Вецер прагназуецца паўднёвы з пераходам на заходні парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе 8—14 градусаў вышэй за нуль, удзень — ад плюс 14 градусаў па паўночным захадзе да 22 цяпла па паўднёвым усходзе краіны.

Дажджлівае надвор'е чакае нас і ў чацвер. У гэты дзень будзе гаспадарыць няўстойлівая паветраная маса, якая паступае з Заходняй Еўропы. Чакаецца пераменная воблачнасць. Месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы, удзень у асобных раёнах — навальніцы. Уначы і раніцай месцамі магчымы слабы туман. Вецер прагназуецца няўстойлівы слабы, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе 5—12 цяпла, удзень — ад плюс 17 градусаў па паўночным захадзе да 24 цяпла па паўднёвым усходзе краіны.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу чаргова франтальны раздзел прынясе на большую частку тэрыторыі Беларусі кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 8—15 цяпла. Удзень будзе ад плюс 15 да 22 градусаў, а месцамі паветра выграецца да 24 цяпла. На выхадныя ападкі прынясе шырокі цыклон з цэнтрам над Украінай. Ужо ў суботу на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць дажджы. У асобных раёнах магчымы навальніцы і моцныя дажджы. Вецер прагназуецца паўночны, паўночна-ўсходні парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе 8—15 градусаў вышэй за нуль, удзень — у асноўным 15—22 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# АДСТАЯЦЬ ПРАЎДУ

**Подзвіг народа ў Вялікай Айчыннай вайне ляжыць у аснове падмурка беларускай дзяржавы, заявіў начальнік аддзела па наглядзе за выкананнем заканадаўства аб дзяржаўнай бяспецы Генеральнай пракуратуры Валерый ШУЛЯК падчас пасяджэння праекта БелТА «Экспертнае асяроддзе» на тэму «Законы аб недапушчэнні рэабілітацыі нацызму і супрацьдзеянні экстрэмізму».**


Фота БелТА.

## ПАМЯЦЬ ПРА ПОДЗВІГ

«Як вядома, грамадска-палітычная сітуацыя ў краіне характарызуецца спробамі дэстабілізацыі абстаноўкі знешнімі і ўнутранымі дэструктыўнымі сіламі шляхам распальвання ў грамадстве варожасці і розні, маніпулявання настроямі часткі насельніцтва, навязвання крайніх формаў пратэснай актыўнасці. Адначасова ідэі нацызму, у аснове якога ляжыць тэзіс аб перавазе адной нацыі над іншымі, адной ідэалагічнай групы над іншай, аднаго чалавека над іншым, перажываюць сваё другое нараджэнне ў іх асучасненых, часам старанна закамуфліраваных і схаваных праявах», — распавёў Валерый Шуляк.

У прыклад ён прывёў падзеі ў Беларусі пасля выбараў 2020 года.

— Згадаем хоць бы той жа абкатаны ў Беларусі рэжысёрамі гібрыдных войнаў і каляровых рэвалюцый пастулат аб «суперлюдзях», якія стаяць у сваім развіцці значна вышэй над усімі астатнімі, што з прычыны сваёй недасканаласці не да канца разумеюць бягучы момант і ўласнае дабро. А вынікам з'яўляецца ўсё тая ж старая песня на новы лад — культываванне радыкалізму, расізму, нацыяналізму, распаўсюджванне ідэалогіі варожасці і нянавісці сацыяльнай, ідэалагічнай, рэлігійнай. Яны, у сваю чаргу, з'яўляюцца спрыяльнай глебай для радыкальных настрояў, здольных перарасці як мінімум у масавыя беспарадкі, як максімум у войны лакальнага і рэгіянальнага ўзроўню, — адзначыў начальнік аддзела.

**E-mail: auction@cpo.by**

# ИНФОРМАЦИЯ О ТОРГАХ

**Организатор электронных торгов:** научно-производственное республиканское унитарное предприятие «Белорусский государственный институт стандартизации и сертификации», 220053, г. Минск, ул. Новаторская, д. 2А, каб. 208, тел.: +375 17 269 69 99; 269 68 77.
**Оператор электронной торговой площадки:** ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».
**Торги проводятся 30.06.2021** на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество», **www.et.butb.by. Время торгов** устанавливается инструментарием площадки в автоматическом режиме

| № лота | Наименование предмета торгов; его местонахождение | Краткая характеристика | Начальная цена лота, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Автомобиль GAZ-2752; г. Минск, ул. Новаторская, д. 2А | Грузовой вагон GAZ-2752, год выпуска – 2001, пробег 72747 км, объем двигателя 2 300 куб. см, бензин, кузов (VIN) № XTH27520010039627; 27520010056989 | 4 255,91 | 500,00 |
| 2 | Автомобиль GAZ-2705; г. Минск, ул. Новаторская, д. 2А | Грузовой вагон GAZ-2705, год выпуска – 2002, пробег 70078 км, объем двигателя 2 400 куб. см, бензин, кузов (VIN) № XTH27050020273937; 27050020103697 | 3 485,58 | 500,00 |

**Продавец:**

**По лоту 1**

*Научно-производственное республиканское унитарное предприятие «Белорусский государственный институт стандартизации и сертификации», г. Минск, ул. Новаторская, д. 2А, каб. 208; тел.: 8 (017) 269 68 77, 269 69 99.*

**По лоту 2**

*Научно-производственное республиканское унитарное предприятие «Белорусский государственный институт стандартизации и сертификации», г. Минск, ул. Новаторская, д. 2А, каб. 208; тел.: 8 (017) 269 68 77, 269 69 99.*

Извещение опубликовано на официальном сайте Государственного комитета по имуществу в глобальной компьютерной сети Интернет 25.05.2021. Электронный адрес http://gki.gov.by/ru.

КАРАНІ І КРОНЫ

Сумесны выпуск газеты «Звязда» і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя

№ 2 (56)

Далучайся!

# УДЗЕЛЬНІЧАЙ! ДУМАЙ! ВЫРАШАЙ ЭКАЛАГІЧНА!

**Мінпрыроды запрашае ўзяць удзел у 1-й Міжнароднай спецыялізаванай экалагічнай выстаўцы-форуме «Ecology Expo — 2021» і XVI Рэспубліканскім экалагічным форуме, якія пройдуць 3-5 чэрвеня ў Мінску.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Удзел у гэтых мерапрыемствах — унікальная магчымасць для росту дзелавой актыўнасці, абмену перадавым і міжнародным вопытам у экалагічнай сферы.

У рамках выстаўкі-форуму будзе прадэманстраваны комплекс інавацыйных ідэй, вытворча-тэхналагічных дасягненняў у вобласці аховы навакольнага асяроддзя і ўстойлівага выкарыстання прыродных рэсурсаў. У ліку прыярытэтаў — работа па дасягненні Мэт устойлівага развіцця, пераход на зялёныя тэхналогіі, падтрымка ўстойлівых мадэляў спажывання і вытворчасці, экалагічна дружалюбны лад жыцця.

Асноўная тэма XVI Рэспубліканскага экалагічнага форуму — «Уцягванне грамадскасці ў прыняцце экалагічных рашэнняў». Работа будзе арганізавана ў фармаце пленарнага пасяджэння і тэматычных секцый, а таксама разнастайных акцый, прэс-мерапрыемстваў, канцэртнай праграмы, рэспубліканскіх конкурсаў экалагічнай скіраванасці.

Плануецца, што ў мерапрыемствах на працягу трох дзён возьме ўдзел больш за 250 дэлегатаў і гасцей, уключаючы міжнародных экспертаў, прадстаўнікоў прыродаахоўных службаў, органаў дзяржаўнага кіравання, устаноў адукацыі і культуры, грамадскіх аб'яднанняў, сродкаў масавай інфармацыі.

Упэўнены, што дзякуючы нашым сумесным намаганням «Ecology Expo — 2021» і XVI Рэспубліканскі экалагічны форум стануць агульнанацыянальнай дыялогавай пляцоўкай і дазволяць выйсці на новыя кірункі развіцця зялёных тэхналогій, будуць спрыяць наладжванню дзелавых кантактаў у пытаннях аховы навакольнага асяроддзя.

**Андрэй ХУДЫК,
міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь.**

Гарачая тэма

# Кліматычная палітыка: рэгіянальная — у звязцы з глабальнай

## Змяненне клімату цалкам спыніць немагчыма, але запаволіць яго неабходна

**Беларусь з'яўляецца падпісантам Рамачнай канвенцыі ААН аб змяненні клімату, а ў 2016 годзе прыняла Парыжскае пагадненне, якое рэгулюе меры па зніжэнні ўтрымання вуглякіслага газу ў атмасферы. Наша краіна ўзяла на сябе пэўныя абавязацельствы, у тым ліку — скараціць да 2030 года выкіды парніковых газаў на 28 % адносна ўзроўню 1990 года.**

Каардынатар Парыжскага пагаднення — Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Яно рэгулярна прадстаўляе ў Сакратарыят Рамачнай канвенцыі ААН Нацыянальны кадастр антрапагенных выкідаў, паведамленне пра адаптацыю да змянення клімату, даклады аб дасягненнях у скарачэнні шкодных выкідаў і іншыя дакументы.

Зацверджаны шэраг стратэгій і нацыянальных адаптацыйных планаў, у прыватнасці, для лясной і сельскай гаспадаркі.

— Нашы міжнародныя абавязацельствы адлюстраваны таксама пры падрыхтоўцы другога Нацыянальна вызначаемага ўкладу Рэспублікі Беларусь у зніжэнне выкідаў парніковых газаў, якія цяпер праходзяць працэдуру ўнутрыдзяржаўнага ўзгаднення. Згодна з дадзенымі кадастра выкідаў парніковых газаў у 2019 годзе, працэнт іх скарачэння адносна ўзроўню 1990 года ў Беларусі ўжо дасягнуў 35 %, — расказала **начальнік упраўлення рэгулявання ўздзеянняў на атмасфернае паветра, змяненне клімату і экспертызы Мінпрыроды Наталля ІНЧЫНА.**




### Рэгіянальны праект «ЕС для клімату»

Згодна з планам мерапрыемстваў па рэалізацыі палажэнняў Парыжскага пагаднення, ажыццяўляецца шэраг праектаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі. Адзін з іх — «ЕС для клімату». Гэта частка рэгіянальнага праекта, які распрацаваны і выконваецца ў краінах Усходняга партнёрства. Еўрасаюз — донар праекта, бюджэт якога ў нацыянальнай частцы складае 1 299 515 долараў. Ён быў зарэгістраваны 27 ліпеня 2020 года і павінен рэалізавацца за два гады. Выканаўчы партнёр праекта — ПРААН, ключавая роля ў яго рэалізацыі адводзіцца Мінпрыроды.

«Мэты праекта — інтэграцыя рашэнняў па пытаннях змянення клімату ў палітыку і планы развіцця нашай краіны, укараненне задач па забеспячэнні кліматычнай устойлівасці, садзейнічанне «зялёнаму» росту эканомікі, узгадненне заканадаўства з праблемамі змянення клімату», — растлумачыла **кіраўнік праекта «ЕС для клімату» Ірына САКАЛОЎСКАЯ.**

Для рэалізацыі праекта сфарміравана каманда нацыянальных экспертаў па энергетыцы, прамысловых працэсах, выкарыстанні прадуктаў сельскай гаспадаркі, адходах. Далучаны міжнародныя кансультанты. Важнейшыя кампаненты праекта — распрацоўка Нацыянальнага плана адаптацыі да змянення клімату, стварэнне Стратэгіі доўгатэрміновага развіцця Беларусі з нізкім узроўнем выкідаў парніковых газаў для асобных сектараў эканомікі, павышэнне міжведамаснай інфармаванасці і каардынацыя органаў дзяржкіравання.

### Вугляродны падатак вымагае новай стратэгіі

Еўрапейскі парламент 10 сакавіка 2021 года прыняў рэзалюцыю аб узгодненым з правіламі Сусветнай гандлёвай арганізацыі механізме трансгранічнага вугляроднага ўрэгулявання ў Еўрасаюзе. Ён з'яўляецца часткай «Зялёнага пагаднення» ЕС, якое стымулюе дэкарбанізацыю галін прамысловасці і садзейнічае дасягненню вугляроднай нейтральнасці.

Еўрапарламент прагаласаваў за ўвядзенне вугляроднага падатку на выкіды вуглякіслага газу. Гэтым падаткам будуць абкладацца ўсе тавары, якія імпартуюцца ў Еўрасаюз, найперш тыя, што ўваходзяць у сектар энергетыкі, у такія энергаёмістыя сектары прамысловасці, як нафтаперапрацоўка, вытворчасць цэменту, сталі, паперы, кардону, алюмінію і іншыя.

У найбліжэйшы час Еўракамісія распрацуе прапановы па механізмах вугляроднага рэгулявання. У Расіі папярэдне падлічаны страты, якія пацерпіць эканоміка краіны пры ўвядзенні гэтага падатку: каля сямі мільярдаў еўра ў год. У нашай дзяржаве створана міжведамасная група па распрацоўцы стратэгіі і плана работы для зніжэння вугляродаёмкасці сектараў эканомікі. Яе каардынатар — Мінпрыроды. У дадзеную рабочую групу ўвайшлі міністэрствы прамысловасці, лясной гаспадаркі, сельскай гаспадаркі і харчавання, антыманапольнага рэгулявання і гандлю; аблвыканкамы, канцэрны «Беллеспрам», «Беллеспаперпрам», «Белнафтахім» і іншыя.

Практычна ўзгоднены з усімі зацікаўленымі план мерапрыемстваў па мінімізацыі рызык для эканомікі Беларусі пасля ўвядзення ЕС пагранічнага вугляроднага падатку. Хутка ён будзе пададзены на зацвярджэнне ўрада.

**Святлана ІШЧАНКА.
Фота з архіва праекта «ЕС для клімату».**

У свеце жывёл

# МІШКА МІЛА ЦЯПЕР У ЗААПАРКУ



www.goodfon.ru

**Больш за месяц таму фотасесія з маленькім медзведзянём, якое згубілася каля Плешчаніц, што ў Лагойскім раёне, нарабіла шмат шуму. Многія патрабавалі прыцягнуць да адказнасці мужчыну, які пазіраваў з жывёлай. Яшчэ больш людзей перажывалі пра лёс касалапага: ці знойдзе ён сваю сям'ю.**

Як толькі стала вядома аб медзведзяняці, якое заблудзіла, сітуацыю ўзялі пад кантроль тэрытарыяльныя органы Мінпрыроды. Цяпер эмоцыі засталіся ў мінулым, а ёсць вынікі ўсебаковай праверкі. «Калі старанна вывучаеш абставіны справы, усё аказваецца трохі не так, як падаецца па гарачых слядах, на эмоцыях. Пачну з таго, што цяпер маленькая мядзведзіца знаходзіцца ў бяспецы — на ператрымцы ў Мінскім заапарку, — дзеліцца **Леанід ІСАЧАНКА, намеснік начальніка аддзела кантролю за аховай і выкарыстаннем зямель, нетраў, біяразнастайнасці, асабліва ахоўных тэрыторый Мінскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.** — Праверка паказала, што саставу адміністрацыйнага правапарушэння — самавольнай канфіскацыі дзікай жывёліны, уключанай у Чырвоную кнігу, з месцаў натуральнага жыхарства, не было. Таму што населены пункт — гэта ніяк не натуральнае асяроддзе для дзікай жывёліны. Несумненна, мядзведзіца, якая апынулася па-за звыклай абстаноўкай, адчувала стрэс, але, зноў жа, яна сама прыйшла ў населены пункт, мясцовыя жыхары яе не выманьвалі з лесу».

У гэтым выпадку можна толькі казаць пра жаданне людзей рабіць сэлфі, здымаць відэа з нагоды і без. У тым ліку тады, калі патрэбна дапамога, а не фотасесія. У сітуацыі, якая склалася, трэба было ўсяго толькі праінфармаваць МНС ці міліцыю, мясцовую інспекцыю ПРіАНА або лясгас. Ва ўсіх гэтых структурах выпрацаваны алгарытм сумесных дзеянняў у розных выпадках: і калі жывёла адбілася ад статку, і калі яна пацярпела, напрыклад, у ДТЗ.

Каб ведаць, як чалавеку паводзіць сябе пры сустрэчы з дзікімі жывёлінамі, раім прачытаць рэкамендацыі Мінпрыроды, размешчаныя на сайце ведамства ў раздзеле «Навіны» ад 15 красавіка 2021 года (спасылка — у QR-кодзе).

У Мінскі заапарк мядзведзіцу перадалі 8 мая, яе назвалі Міла.

**Маргарыта ДРАЗДОВА.**

Устойлівае развіццё

# Зялёная мабільнасць для Полацка і Наваполацка

**«Зялёны» горад — той, у якім лёгка дыхаць і зручна перамяшчацца ўсім: пешаходам, веласіпедыстам і кіроўцам. Як удасканаліць урбаністычную прастору, каб яна стала больш экалагічнай, бяспечнай, камфортнай? Разгледзім на двух прыкладах.**

Праект «Зялёныя гарады» рэалізоўваецца ПРААН у партнёрстве з Мінпрыроды, мясцовымі органамі ўлады і грамадскімі арганізацыямі пры фінансавай падтрымцы Глабальнага экалагічнага фонду. Адна з актуальных задач, якую намагаюцца вырашыць удзельнікі праекта, — зніжэнне выкідаў вуглякіслага газу ў гарадах. Найбольшая доля ў забруджванні паветра прыходзіцца на транспарт. Памяншэнню аўтамабільных выкідаў спрыяюць аптымізацыя сістэмы дарожнага руху, папулярызацыя безматорных транспартных сродкаў і заахвочванне людзей да актыўнага, здаровага ладу жыцця.

Для рэалізацыі праекта былі абраны тры пілотныя гарады: Навагрудак, Полацк і Наваполацк. У Навагрудку работа засяродзілася галоўным чынам на павышэнні энергаэфектыўнасці аб'ектаў ЖКГ, а ў Полацку і Наваполацку — на развіцці ўстойлівай мабільнасці.



«Наезнае» міні-кальцо стварае на перакрыжаванні кругавы рух.

## Калі гарадскі транспарт выйграе

— Удзельнікі праекта па ўзгадненні з Полацкім райвыканкамам памянялі схему арганізацыі дарожнага руху ў горадзе, — патлумачыў **нацыянальны эксперт па мабільнасці і ўстойлівым транспарце Павел АСТАПЕНЯ.** — Выдзелілі асобную паласу для грамадскага транспарту — першую ў Беларусі. І яна паказала эфектыўнасць, асабліва калі на рэканструкцыю закрылі адзін з двух полацкіх мастоў. Нават у гадзіны пік пасажырам аўтобусаў не даводзілася губляць час у заторах. Людзі хутка ацанілі гэтую зручнасць і сталі больш карыстацца гарадскім транспартам. Прыемны бонус для жыхароў Полацка і Наваполацка — усталяваныя на прыпынках сучасныя павільёны чакання.

## Інавацыі ў дарожным руху

На цэнтральных вуліцах Полацка нанесена пластыкавая дарожная разметка. Тэрмін яе службы — 4-6 гадоў у адрозненне ад звыклай фарбавай, якая сціраецца за паўгода. На перакрыжаванні вуліц Камуністычнай і Пушкіна з'явілася першае ў нашай краіне «наезнае» міні-кальцо. Яго асноўнае прызначэнне — зніжэнне хуткасці транспартнага патоку ў канфліктных пунктах, а таксама зменшэнне колькасці гэтых пунктаў дзякуючы арганізацыі кругавога руху. Яшчэ адна інавацыя — падушкі хуткасці, якія вымушаюць запавольвацца легкавыя аўтамабілі з вузкай адлегласцю паміж коламі. Гарадскія ж аўтобусы мінаюць іх без непрыемнага для пасажыраў трасення. Канструктыўныя паўастраўкі бяспекі прадухіляюць паркоўку каля пешаходных пераходаў. Вылучаны спецыяльныя палосы для левага павароту, паколькі ён лічыцца найбольш небяспечным.

Раней кожны святлафор у Полацку працаваў паасобку. Шторaз аўтамабілі спыняліся на чырвонае святло, а потым разганяліся. «Нашы інжынеры ўсталявалі модуль GPS, і цяпер усе святлафоры праз спадарожнік злучаны ў аўтаматызаваную сістэму кіравання дарожным рухам, — распавядае Павел Астапеня. — Такім чынам запушчана «Зялёная хваля»: на святлафорах паслядоўна запальваецца зялёнае святло. Калі кіроўца будзе рухацца з аптымальнай для горада хуткасцю 40—50 км у гадзіну, то з верагоднасцю 75 % ён праедзе без спыненняў усе магістральныя вуліцы. Рэжым «Зялёнай хвалі» ўведзены і ў Наваполацку».

Інфармаванне аўтамабілістаў пра змены ў дарожным руху вялося праз публікацыі на сайце Полацкага райвыканкама, у газеце «Полацкі веснік», афіцыйных інстаграм-каналах, сацсетках. Інспектары ДАІ давалі тлумачэнні кіроўцам.

— З часам стала відавочна, што мадэрнізацыя станоўча ўплывае на дарожны рух, — канстатуе **старшы інспектар АДР аддзела ДАІ Полацкага РАУС Кацярына РАЖАНЕЦ.** — Колькасць дарожна-транспартных здарэнняў у цэнтральнай частцы горада ў 2020 годзе зменшылася ўдвая ў параўнанні з 2019-м.

## Што добра для веласіпедыстаў, тое карысна і пешаходам

Яшчэ адно новаўвядзенне ў Полацку — сетка веласіпедных дарожак на праезнай частцы, адасобленых дэлініятарамі. Яны дазваляюць веласіпедыстам хутка перамяшчацца, не ствараючы пагрозу для пешаходаў. У скверы ўсталяваны веларакоўкі з лаўкамі, аснашчанымі сонечнымі панэлямі і раздымамі для падзарадкі мабільных прылад.

Удзельнікі праекта паклапаціліся і аб наваполацкіх аматарах ровараў. Пракладзеная праз парк веладарожка стала сапраўдным падарункам для месцічаў. Гарадскія ўлады паставілі ўздоўж яе спартыўныя трэнажоры, і цяпер яна прываблівае аматараў розных відаў актыўнага адпачынку. Плануецца працягнуць веладарожку да мяжы прыватнага сектара.

Расце колькасць велагаражоў у жылых таварыствах: у Наваполацку іх ужо каля дзясятка. Паставіць на захоўванне ровар можна бясплатна.

**Аляксандр МЕДЗЕЛЬ, намеснік старшыні велаклуба «Вярста»,** адзначае:

— Усе веласіпедысты заўважылі змены да лепшага. Рух па новых велапалосах, веладарожках становіцца больш камфортным. Цяпер наша галоўная мара — веладарожка, якая злучыць Полацк з Наваполацкам.

Мінпрыроды, мясцовыя органы ўлады і прадстаўнікі грамадскасці маюць намер распаўсюджваць практыкі зялёнай гарадской мабільнасці на іншыя малыя гарады. Партнёрства ўсіх бакоў — адна з галоўных умоў устойлівасці пазітыўных вынікаў.

**Святлана ІШЧАНКА, фота аўтара.**

Міжнароднае супрацоўніцтва

# Амаль 23 тоны САЗ вывезлі з Беларусі на ўтылізацыю

**Аб небяспецы стойкіх арганічных забруджвальнікаў мы пісалі не раз, але зноў нагадаем: нават у малых дозах яны шкодныя для здароўя чалавека і навакольнага асяроддзя. Негатыўнае ўздзеянне САЗ не абмежавана ў часе. Менавіта таму важна перастаць іх выкарыстоўваць, а ад тых, якія захоўваюцца на тэрыторыі нашай краіны яшчэ з савецкіх часоў, неабходна пазбавіцца экалагічна бяспечным спосабам. У Беларусі пакуль няма такога абсталявання і тэхналогій, таму нам дапамагаюць партнёры з Еўрасаюза.**

У прыватнасці, у рамках праекта «Далучэнне грамадскасці да экалагічнага маніторынгу і паляпшэнне кіравання аховай навакольнага асяроддзя на мясцовым узроўні», які фінансуецца Еўрапейскім саюзам і рэалізоўваецца Праграмай развіцця ААН у партнёрстве з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі, завяршылася экалагічная ініцыятыва «Стварэнне механізму экалагічна бяспечнага абясшкоджвання небяспечных адходаў, якія змяшчаюць стойкія арганічныя забруджвальнікі (САЗ)». Рэалізацыяй гэтай ініцыятывы займалася ўстанова па ахове прыроды «Экалогія без межаў».

Як паведаміла **Аляксандра БАЕВА, кіраўнік экалагічнай ініцыятывы ўстановы «Экалогія без межаў»,** з нашай краіны вывезена 22,9 тоны небяспечных адходаў, якія змяшчаюць стойкія арганічныя забруджвальнікі. Такім чынам, на тэрыторыі ААТ «Рэчыцадрэў», дзяржаўнага прадпрыемства «Беларусьнафта-Прамсэрвіс», ЗАТ «Гомельскі вагонабудаўнічы завод», ААТ «Белкард», ААТ «Навагрудскі завод газавай апаратуры» ліквідаваны аб'екты часовага захоўвання небяспечных адходаў. Яны ўтылізаваны на спецзаводзе экалагічна бяспечным спосабам.

Падрыхтоўчая работа па вывазе САЗ уключае ў сябе інвентарызацыю, упакоўку для транспарціроўкі. Затым неабходна атрымаць узгадненне з Мінпрыроды, дазвольныя дакументы на транзіт небяспечнага грузу па тэрыторыі Польшчы і Германіі. Канчатковы пункт маршруту — Францыя. Кошт пакета дакументаў для вывазу САЗаў за мяжу каштуе 5000 еўра. Зразумела, што для прадпрыемстваў, якія маюць, напрыклад, 100 кг САЗ, самастойна вывезці іх немагчыма, таму яны каапеpayюцца, а «Экалогія без межаў» дапамагае ў вырашэнні арганізацыйных пытанняў.

**Вольга ВОЛКАВА, эксперт праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Устойлівае кіраванне стойкімі арганічнымі забруджвальнікамі і хімічнымі рэчывамі ў Рэспубліцы Беларусь, ГЭФ-6»,** адзначыла, што на многіх прадпрыемствах няма сродкаў на арганізацыю вывазу САЗ, а таксама недастатковая кваліфікацыя персаналу, які нават не разумее ўсёй небяспекі гэтых рэчываў. Таму такая важная дапамога міжнародных праектаў, значным складнікам якіх з'яўляецца асветніцкая работа.

На думку **Кацярыны ЧЫЧКО, кансультанта ўпраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі Мінпрыроды,** ініцыятыва аказала неацэнную дапамогу тым прадпрыемствам, у якіх захоўваліся невялікія аб'ёмы САЗ. «Спадзяюся, будуць вывезены ўсе САЗ з тэрыторыі нашай краіны ў адпаведнасці з абавязацельствамі, якія мы на сябе ўзялі ў рамках Стакгольмскай канвенцыі, а менавіта: да 2028 года поўнасцю абясшкодзіць адходы, якія змяшчаюць ПХБ», — рэзюмавала прадстаўнік прыродаахоўнага ведамства.

**Дзяніс КАВАЛЕНКА, кіраўнік праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Устойлівае кіраванне стойкімі арганічнымі забруджвальнікамі і хімічнымі рэчывамі ў Рэспубліцы Беларусь, ГЭФ-6»,** паведаміў, што ў перыяд з 2009 да 2013 года ў рамках праекта ГЭФ і Сусветнага банка было забяспечана знішчэнне 1800 тон пестыцыдаў, якія ўтрымлівалі САЗ і 823 тоны абсталявання з утрыманнем або забруджанага ПХБ з ліку запасаў, пазначаных у якасці прыярытэтных з прычыны павышанай рызыкі. Яшчэ 14,7 тоны абсталявання, якое ўтрымлівала ПХБ і знаходзілася на балансе малых уладальнікаў, было знішчана ў 2015—2016 гады за кошт інавацыйнай праграмы, якая ажыццяўляецца ГА «Зялёная эканоміка» ў рамках праграмы малых грантаў ГЭФ. У 2016 годзе, падчас рэалізацыі праекта ЕС і Харчовай і сельскагаспадарчай арганізацыі ААН (ФАО), знішчана 330 тон непрыдатных пестыцыдаў.



Фота «Экалогія без межаў».

**Аксана ЯНОЎСКАЯ.**

| ООО «Центр Белинвентаризация»<br>г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 | ✓ Раздел и установление порядка пользования земельным участком<br>✓ Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения<br>✓ Пересчет долей в связи с изменением капитального строения |
|---|---|

## Извещает о проведении повторного аукциона по продаже имущества ОАО «Гомельский литейный завод «ЦЕНТРОЛИТ», тел. 8 (044) 544 38 37

| № лота | Наименование объекта | Начальная цена, бел. руб. с НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Оздоровительный лагерь «Литейщик», расположенный по адресу: Гомельская обл., Гомельский р-н, Приборский с/с, 4 в составе:<br>- капитальное строение (скважина артезианская) с инв. № 310/С-48017; - капитальное строение (скважина артезианская) с инв. № 310/1-48018; - капитальное строение (здание спального корпуса № 1) с инв. № 310/С-49810, общей площадью 230,5 кв. м; - капитальное строение (здание спального корпуса № 3) с инв. № 310/С-49811, общей площадью 101,5 кв. м; - капитальное строение (здание изолятора) с инв. № 310/С-49813, общей площадью 73,2 кв. м; - капитальное строение (здание летней эстрады) с инв. № 310/С-49814, общей площадью 240,8 кв. м; - капитальное строение (здание уборной (туалет) с инв. № 310/С-49815, общей площадью 42,7 кв. м; - капитальное строение (тепловая сеть) с инв. № 310/С-68107, протяженностью 287,5 м; - капитальное строение (профилакторий на 100 мест) с инв. № 310/С-46344, общей площадью 3107,9 кв. м; - капитальное строение (трансформаторная подстанция) с инв. № 310/С-48013, общей площадью 41,1 кв. м; - капитальное строение (трансформаторная подстанция) с инв. № 310/С-48014, общей площадью 22,6 кв. м; - капитальное строение (здание котельной) с инв. № 310/С-48015, общей площадью 235,5 кв. м; - капитальное строение (здание овощехранилища) с инв. № 310/С-48016, общей площадью 60,9 кв. м; - капитальное строение (здание столовой) с инв. № 310/С-49812, общей площадью 280,9 кв. м; - капитальное строение (кабельная линия освещения) с инв. № 310/С-68102, протяженностью 147,1 кв. м; - капитальное строение (сети канализации) с инв. № 310/С-68106, протяженностью 397,1 м; - капитальное строение (высоковольтная кабельная линия) с инв. № 310/С-68103, протяженностью 310,8 м; - капитальное строение (высоковольтная кабельная линия) с инв. № 310/С-68104, протяженностью 773,6 м; - капитальное строение (сети водопровода) с инв. № 310/С-68105, протяженностью 413,7 м.<br>Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 321085200001000071.<br>- лифт ПГ-241 (инв. 4192); - пункт распределительный (инв. 4166); - трансформаторная подстанция (инв. 4167); - пункт распределительный (инв. 4168); - пункт распределительный (инв. 4169); - пункт распределительный (инв. 4170); - пункт распределительный (инв. 4171); - пункт распределительный (инв. 4172); - пункт распределительный (инв. 4173); - пункт распределительный (инв. 4177); - пункт распределительный (инв. 4178); - пункт распределительный (инв. 4180); щит низковольтный ЩО (инв. 4276); - распределительный пункт (инв. 4280); - трансформаторная подстанция КНТН-400 (инв. 2100); - трансформатор ТМ 160/10 (инв. 4551); - трансформатор ТМ 250/01 (инв. 4550). | 401 231,53 | 40 123,15 |
| 2 | - котельная установка (инв. 4165), находящаяся по адресу: Гомельская обл., Гомельский р-н, Приборский с/с, 4/1 (в капитальном строении с инв.№310/С-48015 (здание котельной). | 67 200,00 | 6 720,00 |

| | |
|---|---|
| **Срок подачи заявления** | **По 7 июня 2021 г**. в рабочие дни с 9.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| **Дата, время, место проведения аукциона** | **9 июня 2021 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | BY71 BPSB 3012 1783 3901 0933 0000 в РД № 300 ОАО «БПС- Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 491323266.<br>Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация».<br>Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещению в газете ***«Звязда» от 25.05.2021 г.*** |
| **Условия продажи** | Объект продается в собственность. Шаг аукционных торгов – 5 %. Заключить договор купли-продажи в течение 20 (двадцати) календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона. Оплатить стоимость лота, сформированную на аукционе в течение 30 (тридцати) календарных дней с момента подписания договора купли-продажи.<br>***Необходимые условия для Победителя аукциона по лоту № 1*** – обеспечить беспрепятственный доступ (проезд, проход) к капитальному строению с инвентарным номером № 310/С-47658 (здание КНС), расположенному по адресу: Гомельская обл., Гомельский р-н, Приборский с/с, 4/3; – обеспечить транзит электроэнергии и водоснабжения к существующим потребителям. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 06.02.2021 г.<br>Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона |

**Дополнительная информация на сайте www.bti-gomel.by, по тел.: (0232) 50 56 62, (029) 341 15 45**

УНП 491323266

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ОАО «БЕЛРЕМСТРОЙСВЯЗЬ»

Лот № 1, состав: 1. А 1/к. Здание склада, инв. № 500/С-24336, 744 кв. м, г. п. – 1972; 2. Склады, инв. № 500/С-65757, 329,7 кв. м, г. п. – 1973; 3. Склады, инв. № 500/С-65956, 58,9 кв. м, г. п. – 1975. Адрес: г. Минск, ул. Платонова, 14, 14/1, 14/2. Обременение: аренда. Начальная цена, бел. руб. – 566 406,00 с НДС. Задаток, бел. руб. – 56 640,60. Шаг аукциона – 5 %. Земельный участок площадью 0,4758 га с кадастровым номером 500000000004000019. Право аренды (по 28.02.2050). Переход права осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.
Аукцион состоится 21.06.2021 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by. Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, BIC банка BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений и задатков – 17.06.2021 в 11.00.

• Организатор аукциона: 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, тел.: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

БЕЛАРУСБАНК

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона – ОАО «АСБ Беларусбанк» (Гомельское областное управление № 300) (тел.: (0232) 512130, +375 29 180-88-05).

Наименование объекта продажи – изолированное помещение общей площадью 355,6 м², с инвентарным номером 340/D-221878, расположенное в Гомельской области, г. Речица, ул. Советская, 110-2.

Начальная цена продажи составляет 348 354,07 бел. руб. (триста сорок восемь тысяч триста пятьдесят четыре белорусских рубля 07 копеек), в том числе НДС – 20 %.

Ограничение (обременение) прав на изолированное помещение: договор аренды № 115 от 01.07.2020, заключенный с ОДО «Семья и Здоровье» (УНП401162694). Срок действия договора по 31.08.2025.

Сумма задатка – 1000,00 бел. руб. (одна тысяча бел. руб.).

Открытый аукцион состоится 13.07.2021 в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Фрунзе, 6а, актовый зал (помещение на четвертом этаже).

Заявление на участие принимается до 12.07.2021 включительно по адресу: г. Гомель, ул. Карповича, 21, кабинет 3: пн. – чт. с 9.00 до 16.30, пт. – с 9.00 до 15.30.

По вопросам, связанным с объектами продажи, обращаться по телефону: (0232) 51 21 30 – Ладыженко Светлана Станиславовна.

Продавец – ОАО «АСБ Беларусбанк». Договор купли-продажи регистрируется в органе по государственной регистрации по месту нахождения объекта за счет покупателя.

Для участия в открытом аукционе предоставляется заявление и документ с отметкой банка о внесении суммы задатка на счет № BY69AKBB66708597000020000000 БИК AKBBBY2X в ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 100325912.

К заявлению также прилагаются:

юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию;

иностранным юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

представителем юридического или физического лица – доверенность (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель). Доверенность от имени нерезидента Республики Беларусь должна быть легализована в установленном законодательством порядке, перевод на белорусский или русский язык нотариально заверен.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий полномочия (приказ о назначении на должность, или выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

При подаче заявления организатором открытого аукциона с участниками заключается соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены с учетом НДС. Победителем открытого аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Победителем аукциона возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения торгов в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты его проведения.

Договор купли-продажи по результатам проведения аукциона должен быть подписан в течение 30 календарных дней со дня проведении открытого аукциона.

Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи и документацией на объект.

## Извещение о проведении аукционных торгов по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов и земельных участков в г. Бресте в частную собственность граждан Республики Беларусь

| № лота | Наименование объекта/ Адрес участка | Кадастровый номер | Общая площадь (га) | Целевое назначение использования участка | Начальная цена предмета аукциона (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расходы по подготовке зем.-кадастр. док. (руб.) | Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке, в т. ч. ограничения и условия в его использовании | Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 2 | не завершенный строительством законсервированный одноквартирный жилой дом в г. Бресте, **улица Нектарная, 104** (площадь застройки 192 кв. м, готовность 10 %) и земельный участок | 140100000001023284 | 0,1021 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | **40 133,73** | 8 000,00 | **2 852,69** | 0,0007 га – охранная зона линий, сооружений электросвязи и радиофикации;<br>0,0028 га – охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт;<br>0,019 га – охранная зона объектов газораспределительной системы (газопровод среднего давления);<br>0,1014 га – на мелиарируемых (мелиорированных) землях | газоснабжение, водоснабжение, электроснабжение |
| 3 | не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом в г. Бресте, **улица Засима, 63** (площадь застройки 213 кв. м, готовность 9 %) и земельный участок | 140100000001022915 | 0,1079 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | **42 010,32** | 8 400,00 | **2878,46** | 0,0032 га – охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт;<br>0,0030 га – охранная зона объектов газораспределительной системы (газопровод среднего давления);<br>0,1070 га – на мелиорируемых (мелиорированных) землях | газоснабжение, водоснабжение, электроснабжение, канализация |

| | |
|---|---|
| **Размер штрафа,** уплачиваемый в случаях, определенных Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220, и Указом Президента Республики Беларусь «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» от 05.05.2009 г. № 232 | **2 900,00 рублей** |
| **Организатор аукционных торгов –** КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью», г. Брест, ул. Ленина, 50-23. Контактный телефон: 53 81 92. | **Задаток в размере до 20 % от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № BY73AKBB30127803600111000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код банка AKBBBY2X, УНП 290433924 в срок до 13.05.2021 г.** |

**Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220,** и состоится при наличии не менее двух участников. В аукционе могут участвовать граждане Республики Беларусь.
**Перечень документов, представляемый участником аукциона**: заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина** – нотариально удостоверенная доверенность; **представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица** – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.
При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
**Лицо, желающее принять участие в аукционе**, **обязано** подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов

**Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан:**
• в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов:
- часть оплаты предмета аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке за земельный участок), за вычетом суммы, причитающейся за не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом;
- часть платы за предмет аукциона – цена продажи не завершенного строительством незаконсервированного одноквартирного жилого дома, исчисленную пропорционально его удельному весу в начальной цене предмета аукциона, за вычетом расходов, понесенных на оплату оценки;
- возместить расходы, понесенные городским бюджетом по изготовлению земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка;
- компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников);
• подать заявление о государственной регистрации права на не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом и частной собственности на земельный участок в РУП «Брестское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в течение двух месяцев со дня подписания протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся;
• в течение одного месяца с момента государственной регистрации получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и строительство одноквартирного жилого дома и нежилых построек на придомовой территории на предоставленном земельном участке;
• разработать в установленном порядке проектную документацию на строительство одноквартирного жилого дома;
• представить изготовленную проектную документацию на согласование в Брестский городской исполнительный комитет;
• завершить строительство объекта в сроки, установленные действующим законодательством.

**Аукцион состоится 29 июня 2021 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, актовый зал**
**Заявления на участие в аукционе принимаются с 8.30 25.05.2021 г. до 17.00 23.06.2021 г. (перерыв с 13.00 до 13.45; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50-23. Контактный телефон 53 81 92.**
**Сайты: www.bgcn.by, www.city.brest.by, www.brest-region.gov.by и www.gki.gov.by**

# «НА ГАСТРОЛІ ЕЗДЗІЛІ НА ТРАКТАРЫ...»

## Навошта сучаснаму чалавеку народныя песні?

**Ці можна захаваць традыцыйную песенную, танцавальную, музычную культуру ва ўмовах знікнення традыцыйнага ўкладу жыцця, бо сёння ў нашай краіне людзі пераважна імкнуцца жыць у гарадах? І калі ўсё ж можна — то навошта гэта рабіць? Пра гэта мы спыталі ўдзельнікаў народнага сямейнага ансамбля «Жывіца» з вёскі Бор Пухавіцкага раёна.**

### ЭКСКЛЮЗІЎ З ВЁСКІ БОР

Аграгарадок Бор нічым асаблівым не адметны — звычайны маленькі населены пункт, якіх на Беларусі тысячы. Той, адкуль моладзь імкнецца з'ехаць пры першай магчымасці. Ну, хіба што побач геаграфічны цэнтр Беларусі, хоць прывабным для турыстаў гэтае месца так і не стала. Але дзякуючы народнаму сямейнаму ансамблю «Жывіца» ў вёскі ёсць «сваё аблічча», а яе назва вядомая спецыялістам далёка за межамі краіны. У рэпертуары ансамбля аўтэнтычныя беларускія песні, абрады, танцы, а таксама ўкраінскія, рускія песні, музычныя кампазіцыі на беларускіх народных інструментах (дуда, дудка, жалейка, баян, гармонік) і нават эстрадныя нумары. Але аснова рэпертуару калектыву — тыя мясцовыя песні, якія спяваліся ў ваколіцах Бора са спрадвечных часоў.

— Спрадвечная музычная культура любой мясцовасці заўсёды адрозніваецца яркай своеасаблівасцю. Яна нясе ў сабе эксклюзіў, — распавядае **мастацкі кіраўнік Борскага сельскага Дома культуры Наталля КРЫВАШЭЙ.** — Аснова папулярнасці артыста, які выступае ў любым жанры — якраз уласны «творчы почырк», уменне быць асаблівым, запамінальным, у чымсьці непаўторным. У фалькларныя песні і абрады любой мясцовасці (напрыклад, у нашы, пухавіцкія) ужо першапачаткова гэты эксклюзіў закладзены. І для артыста тое вельмі каштоўна.

Дыпломы, якія калектыў прывозіць з міжнародных фестываляў, ужо не ўмяшчаюцца на сценах невялікага кабінета дырэктара Борскага ДК — ляжаць на стале, стаяць на паліцах: з Латвіі, Польшчы, Германіі, Расіі... «Апошнія дыпломы ніяк не павесім — здаецца, ужо няма куды...» — смяецца суразмоўніца.

### «СПЯВАЛІ, ЯК УМЕЛІ...»

Напэўна, менавіта гэтая мясцовасць — адна з самых удалых для стварэння падобнага калектыву: тут яшчэ ў 90-х жылі зусім традыцыйным укладам.

— Пачалося ўсё з чаго?.. — павольна, са смакам пачынае свой аповед **Таццяна МАЗАНІК, дырэктар Борскага сельскага Дома культуры і салістка ансамбля «Жывіца».** — Наогул, я па прафесіі закройшчык. Было гэта ў 1990-х. На той час знаходзілася ў дэкрэце — нарадзіла аднаго сына, потым другога і стала думаць, куды выходзіць на работу. А мой брат, Наташын муж, працаваў гукааператарам у Доме культуры («дыджэем», як кажуць у нас у вёсцы). І неяк брат Юра мне і кажа: «Пайшла б ты працаваць у клуб?». Я ў адказ: «Баюся, не ведаю там нічога!» А ён: «Паспрабуй». Тады якраз пайшла на пенсію дырэктар клуба, і замяніць яе не было кім. Параілася з мамай, і яна была згодная з братам: «Трэба паспрабаваць». Так я, яшчэ зусім маладая, стала дырэктарам сельскага Дома культуры.

На новую пасаду Таццяна заступіла ў снежні 1993 года, а ў лютым у калгасе павінен быў праходзіць справаздачны сход.

— А гэта закон: «культура» павінна зрабіць да справаздачнага сходу канцэрт, — працягвае дырэктар. — А як яго зрабіць, калі калектыву няма?.. Ну, сабрала я тых бабак... Як збірала? Пайду па хатах, прыходжу: «Дзядзька Федзя, адпусціце цётку Надзю паспяваць!» — «Якое «спяваць», хай дома сядзіць, работу робіць!» — «Ну дзядзька Федзя!.. Ну і вы прыйдзіце, паспявайце...»

***— Сем'і ў вашай мясцовасці былі такія, што жонка без дазволу мужа не магла ўзяць удзел у канцэрце?***

— Так. Не было такога, каб жонка сыходзіла ўвечары кудысьці, а тым больш у клуб... Пачаліся рэпетыцыі. Спявалі, як умелі. Спачатку ў нас нават не было акампаніятара, акапэльна цягнулі. Потым з'явілася ў нас дзяўчына-музыкант, іграла на гармоніку. Сабралася артыстаў тады ў мяне чалавек дзесяць. І вось павінен адбыцца наш першы канцэрт. Трэба ж адзець маіх выступоўцаў! А ў што я іх адзену? Прыйшлося прасіць дапамогі ў калег — работнікаў сферы культуры з суседняй вёскі. Паехала я туды, у клуб, далі мне спісаныя народныя касцюмы. Але аказалася, што іх паела моль — тканіна ж натуральная! Кашулі так-сяк мы зашылі, а спадніц няма. Пайшла я тады ў КБА і купіла пакрывалы, падобныя на даматканую тканіну. З іх і нашыла артыстам касцюмаў... Ну добра, першы канцэрт. Пачалі мы з бабкамі спяваць, адна дзяўчынка на віяланчэлі іграла, гармонік быў — і ў нас такі канцэрт атрымаўся, проста любата! Вельмі цёпла прымалі нас гледачы. І пасля таго канцэрта артыстаў у нас у калектыве стала больш, моладзь падцягнулася.

Таццяна паказвае мне чорна-белае фота:

— Вось тут наш першы састаў. І тыя бабулечкі, і дзяўчаткі маладыя. Потым прыйшлі да нас і мужы нашых артыстак. Спявалі, выязджалі «на гастролі» ў суседнія вёскі. Ездзілі на трактары. Паставім на прычэп лаўкі, едзем на канцэрт і спяваем: рэпеціруем. Грошыма нам не плацілі за канцэрты. Але частавалі чым маглі. І проста неверагодна цёпла прымалі: сцэну да нашага прыезду заўсёды ўпрыгожвалі, а калі мы пачыналі спяваць, гледачы і падпявалі, і не-не, ды і пускаліся ў скокі. Аддача залы была проста вар'яцкая! Людзі тады былі вельмі простыя. Дабрэйшыя за сучасных, напэўна. Памятаю, прыходзім на рэпетыцыю — спачатку ўсе навіны раскажам, потым я кажу: «Усё, пяём!» Прыдумлялі кожны раз, чым здзівіць свайго гледача на канцэрце. Праз дзень па вечарах рэпеціравалі. А потым пажылыя мае артысты пачалі хварэць і паміраць, моладзь раз'ехалася. І засталіся мы з Наташай удзвюх з першага саставу — яна тады якраз каледж мастацтваў скончыла. Я кажу: «Трэба нешта рабіць, калектыў збіраць!» А каго тут збярэш? Вакол паміраючыя вёскі...

Падумалі-падумалі Таццяна і Наталля і вырашылі, што калектыў будзе сямейны. Так і з'явіўся народны сямейны ансамбль «Жывіца».

— Спяваем я і Наташа, мой брат (яе муж) у нас гукааператар, яшчэ адзін саліст — Сяргей Шыкунец, мой стрыечны брат, — тлумачыць Таццяна. — Кіраўнік калектыву — Юрый Крывашэй. Ён сын Наталлі і пайшоў па слядах маці — у мастацтва. Адвучыўся ва ўніверсітэце культуры, цяпер ён — рэжысёр у Мінску, ну і па сумяшчальніцтве кіраўнік «Жывіцы». Ёсць у калектыве і музыканты. Так што справа ў нас цяпер пастаўлена прафесійна. Збіраем народныя песні, кладзём словы на музыку. У 2010 годзе нам далі статус сямейнага калектыву, а ў 2016-м — прысвоілі ганаровае званне «Народны».



### «БЕЗ ПЕСНІ БЫЛО Б ЦЯЖКА...»

***— Вы спяваеце народныя песні... Чаму гэта вам цікава і што дае?***

Таццяна ўсміхаецца:

— У прынцыпе, можна ж па-рознаму працягваць традыцыі свайго краю: пячы хлеб па старадаўніх рэцэптах або вышываць, або гадаваць дзяцей паводле правілаў з народнай педагогікі. Але асабіста мне блізкая песня. Мая мама, Зінаіда, вельмі прыгожа спявае — я памятаю яе голас і яе песні з ранняга дзяцінства. Так што да песеннай народнай культуры ў мяне, можна сказаць, асабістая прыхільнасць. І, ведаеце, мне здаецца, без песні было б цяжкавата жыць цяпер...

Традыцыйная народная культура, кажуць мне, каштоўная тым, што нясе ў сабе пазітыўны вопыт народа.

— Гэты досвед дапамагае ў любых сітуацыях, як бы складана ні даводзілася, захаваць унутры і вакол сябе нейкую гармонію — з навакольнымі людзьмі, блізкімі і малазнаёмымі, з прыродай, са штодзённым жыццём, — тлумачыць Наталля.

Мае суразмоўніцы ўпэўненыя, што прыхільнасць да народнай культуры нараджаецца ў глыбіні душы — і цалкам упісваецца ў сучасныя рэаліі. Невыпадкова сёння ў маладзёжнай музыцы існуе трэнд на этнічныя матывы. І нават не так важна, захапляюць вас родны беларускі фальклор, якая-небудзь старажытная кельцкая традыцыя або нават афрыканскія рытмы. У любой этнічнай традыцыі ёсць тая няўлоўная гармонія (некаторыя даследчыкі называюць яе тэрмінам «экалагічнасць»), якая і сёння, як і стагоддзі таму, здольная кранаць душы самых розных людзей. Зрэшты, у рэпертуары калектыву, акрамя старадаўніх песень, ёсць і некалькі сучасных эстрадных нумароў.

— Гэта для «гастроляў» па навакольных населеных пунктах, для святочных мерапрыемстваў мясцовага маштабу. Зразумела, на сур'ёзныя фестывалі мы «Стаса Міхайлава» не возім.

***— Стаса Міхайлава?..***

— Наш вакаліст Сяргей валодае моцным голасам і часам спявае песні Стаса Міхайлава, — тлумачыць Таццяна Мазанік. — Як паедзем у Чэрвеньскі раён або ў Беразіно — там і кветкі, і каробкі цукерак — усё для нас, калі з намі ёсць Сярожа, — усміхаецца суразмоўніца. — Вядома, каранавірус унёс свае карэктывы. Але наогул нам могуць патэлефанаваць раніцай і запрасіць на мерапрыемства — і мы ўжо ўвечары дадзім канцэрт. Галоўнае, каб усе нашы вакалісты былі свабодныя. А калі ўсіх не збяром — утраіх едзем: я, Наталля і гукааператар. Мы і ўтраіх можам зрабіць нядрэнны канцэрт прыкладна на гадзіну.

***— Вы кажаце, што ў 90-х гледачы былі больш спагадлівыя. А цяпер? Ці ёсць аддача залы?***

— Гледача цяпер нічым не здзівіш, — уздыхае Наталля. — Цяжка падняць залу. Але калі ў зале будзе некалькі «завадных» гледачоў (мы такіх называем «запалкі»), разварушыць людзей атрымаецца хутчэй.

Часам, распавядаюць суразмоўніцы, даводзіцца нават рэзка мяняць ход канцэрта. Справа ў тым, што сапраўдныя, аўтэнтычныя народныя песні сёння досыць складана ўспрымаюцца — каб пачуць закладзеную ў іх гармонію, патрэбны пэўны музычны інтэлект. Сучасны слухач прывык да «папулярнай музыкі» — а сапраўдныя народныя песні, без аранжыроўкі, часам гучаць дзіўна і незразумела для сучаснага чалавека. І каб зразумець такія песні, трэба ўслухоўвацца, засяроджвацца. Але ж оперу таксама разумее далёка не кожны.

— Таму мы робім аранжыроўкі і апрацоўкі старадаўніх песень, хоць для падрыхтаванай аўдыторыі можам выконваць і аўтэнтычную версію, — распавядае Наталля.

— А наогул мы ў рэшце рэшт падымаем любую залу, любую аўдыторыю, — кажа Таццяна. — Таму што гэта трэба ў першую чаргу нам самім: выступаць нашмат лягчэй і цікавей, калі людзі не сядзяць, склаўшы рукі на каленях, з сумнымі тварамі. У нас і назва такая — «Жывіца»: як смала-жывіца загойвае раны на ствале і галінках дрэва, так мы загойваем раны ў сэрцах і душах. І ўзнімаем настрой!

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

---

Зоркі

# СПЯВАК — НЕ ПРОСТА ІНСТРУМЕНТ

**У Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета адбылася прэс-канферэнцыя Кацярыны СЕМЯНЧУК, опернай спявачкі, чыё імя вядома ва ўсім свеце.**



### Як працуецца на Беларусі?

Кацярына Семянчук не забываецца на сваю радзіму.

— Калі б не было мары выступаць у Вялікім тэатры Беларусі — я тут бы цяпер не сядзела. Я другі раз выступаю на сцэне гэтага тэатра і адчуваю неверагоднае захапленне і натхненне. З ранняга дзяцінства наведвала тут усе спектаклі і ведала ўвесь рэпертуар. Я ніколі не губляла сувязі з маім горадам, краінай, з тымі, з кім вырасла. Хоць у мяне інтэрнацыянальная сям'я, але, калі атрымлівала пашпарт, у ім было напісана «беларуска». Таму што я так сябе заўсёды адчувала. І, знаходзячыся ўдалечыні, я заўсёды магла адкрыць кнігу на беларускай мове, якую прывезла з Мінска. Я перапісвала вершы, думала па-беларуску.

### Пра маладое пакаленне спевакоў

Прымадонна лічыць сябе прыналежнай да тых беларусаў, якія, хоць і не жывуць на радзіме, але працягваюць любіць і прапагандаваць беларускую культуру.

— Напрыклад, часта выконваю творы Дзмітрыя Смольскага, якога яшчэ памятаю жывым, здаровым, у выдатнай форме. Як ён па кансерваторыі хадзіў, вельмі сціплы... На тых, хто за нас старэйшы і больш вопытны, мы глядзелі як на жыхароў неба. Зараз, у век інтэрнэту, даючы майстар-класы, я сутыкаюся з татальнай даступнасцю. Няма ўжо такога, што, каб паслухаць спевака, трэба ісці ў тэатр. Бо трансляцыі запісваюць, выкладаюць. Кажаш студэнту — «Вось тут трэба так зрабіць — так будзе лепш», а ён адказвае: «А я сам ведаю!»

Калісьці я хадзіла, глядзела на знакамітых артыстаў, бачыла, як яны працуюць. Яны цалкам аддавалі сябе. Гэта выклікала захапленне. І хацелася быць такой жа, як яны. А цяпер бачу дваццаціпяцігадовых, якія ўжо даюць майстар-класы і кажуць пра сябе: «Я зорка, чаму не?» Не шануецца нешта больш глыбокае, чым проста вывучаныя ноты. І наша задача, артыстаў, спевакоў, музыкаў, — працягваць асветніцкую дзейнасць.

### Пра выдаткі і здабыткі прафесіі

Спявачка, нягледзячы на сусветную вядомасць, застаецца чалавекам з вялікім сэрцам.

— Калі я выходжу на сцэну, чым больш аддаю — тым больш у мяне з'яўляецца сіл. Але толькі тады, калі робіш усё бескарысліва. Я чула ад педагогаў старэйшага пакалення: «Трэба берагчы сябе — не атрымліваецца. Можа, таму мы ніколі не бываем здаровыя на сто працэнтаў. Спявак — гэта такі інструмент, які заўсёды настроены, заўсёды адкрыты. Нават наша слізістая заўсёды разагрэта, нас лёгка застудзіць, таму што мы заўсёды гатовыя да спеваў. І гэта, вядома, робіць нас вельмі адчувальнымі і далікатнымі.

**Ангеліна ВАРАТЫНСКАЯ.**

# Рыцарская мара, прывідны леў і сатыра Элаізы



## Чаму Косаўская Чорная дама ненавідзіць п'яніц і ігракоў

**ЗВЫЧАЙНА легенды назапашваюцца стагоддзямі... Чым больш старажытныя муры — тым больш гісторый аб прывідных воінах, чорных альбо белых дамах, шэрых мніхах, праклятых скарбах і замураваных сутарэннях... Палац, пра які мы сёння пагаворым, узнік у другой палове XVIII стагоддзя, у эпоху Асветніцтва, але містычных гісторый вакол яго столькі, што хапіла б на некалькі больш старажытных замкаў...**

Мяркуйце самі.

Тут і Чорная дама — былая гаспадыня палаца, якая пільнуе яго спакой і маральнасць гасцей.

Тут жа — прывід маладой служанкі. Дзяўчына нібыта адпрэчыла заляцанні аднаго з магнатаў, за што была падступна выштурхнута ім ноччу ў калідор на з'ядзенне льву, якога выпускалі вартаваць палац. Ну і прапала дзеўка бедная...

Дарэчы, і леў, як належыць яркаму персанажу, таксама некаторымі перадодзіцца ў «разрад» прывідаў — маўляў, дасюль блукае па руінах і рыкае.

Нават дзікае паляванне караля Стаха чамусь прывязалі да Косаўскага палаца. Маўляў, скача ціхімі месяцовымі начыма, шукае, паводле версіі Уладзіміра Караткевіча, здрадніка Рамана...

А ёсць нібыта яшчэ і падземны ход — ды такі, што карэта, запрэжаная трыма коньмі, магла праехаць. І цягнуўся той ход ажно да Ружан...

Фігуруе ў легендах і пасыпаная соллю дарога, па якой улетку на санях ездзіла гаспадыня палаца, прыпадабняючыся Пане Каханку. І скарбы ў сутарэннях, і «музычная сцяна», якая гучыць, калі па ёй ударыць, а мо «музычны падаконнік» на другім паверсе — калі, стаўшы на яго, пляснуць у ладкі, водгулле пойдзе адусюль...

Зрэшты, сам выгляд палаца ў Косаве правакуе на містычныя легенды — такі ён гатычны, рамантычны... Недарэмна сучаснікі называлі яго «рыцарскай марай».

Давайце паглядзім на вядомыя факты пра Косаўскі палац і падумаем, як маглі некаторыя з іх спарадзіць легенды.

## Горкі прысмак венгерскага віна

Пачнём з Войцеха Пуслоўскага, якому дастаўся маёнтак Косава ад Флемінгаў. Чалавек ён быў надта прадпрымальны. Дарогі будаваў, млыны, вінакурні, прадпрыемствы па вырабе жалеза, сукна, паперы, шкіпінару, дываноў... Ужываў паравыя рухавікі, землі прыкупаў нечуванымі прасторамі... А чаму ж не, калі брат жонкі Юзафіны — міністр фінансаў Царства Польскага...

Улады мяняліся... Войцех Пуслоўскі ўмудраўся заставацца пры ўплыве ды грашах. У Вялікім Княстве Літоўскім быў дэпутатам Трыбунала, у Расійскай імперыі стаў правадзейным стацкім саветнікам. Дарэчы, добры прыбытак меў ад паставак у расійскае войска.

Захаваліся ўспаміны пра тое, як Войцех Пуслоўскі ўвесну 1825 года змог дамагчыся права запрасіць на абед цара Аляксандра I, калі той з Царскага Сяла ехаў у Варшаву. Пуслоўскі, уладальнік вёскі Міхалін, прымаў цара ў доме Міхалінскай паштовай станцыі, аздобіўшы інтэр'ер так, што дом нагадваў маленькі палац (натуральна, што імператар не збіраўся збочваць з дарогі дзеля наведвання нейкіх там маёнткаў). Абед быў шыкоўны... Усё на смак імператара. А мэтай такіх затрат з боку Пуслоўскага было выпрасіць памілаванне для сына Цітуса, які служыў у кавалергардскім палку і за год да таго ўвязаўся ў двубой, за што быў разжалаваны ў жаўнеры. Згодна з мемуарамі сучасніка, Войцех знайшоў момант закінуць слоўца за сына, калі цар пахваліў пададзенае да стала венгерскае віно: «Ваша вялікасць! Я вельмі шчаслівы, што гэтае венгерскае заслужыла такую ўхвалу ад вашай вялікасці; яно ў мяне дамашняе і ўзята з тае бочкі, якая захоўвалася да сення з дня нараджэння майго няшчаснага сына, які служыў у кавалергардскім вашае вялікасці палку».

Цар яшчэ раз пахваліў віно, намёк прапусціў міма вушэй, на гэтым усё і скончылася, што са зласлівасцю занатавалі ў дзённіках прыдворныя.

Дарэчы, звычай у тутэйшых шляхецкіх сем'ях ставіць пры нараджэнні сына на захоўванне бочку віна, запячатканы яшчэ пры каралі венгерскага паходжання Стафане Баторыі — называлася такое віно на мёдзе «батурын» і ўжывалася ў самых урачыстых выпадках, звычайна на вяселлі таго, у гонар чыйго нараджэння было пастаўлена. Так што Пуслоўскі паступіў вельмі сімвалічна.

## Прыхільнік Касцюшкі

Ва ўсёй сваёй прыгажосці Косаўскі палац паўстаў пры новым уладальніку, малодшым сыне Войцеха Вандаліне Пуслоўскім. Будаўніцтва пачалося ў 1838-м, праз пяць гадоў пасля смерці Войцеха. На вызначэнне месца пабудовы паўплывала тое, што побач — радавая сядзіба Тадэвуша Касцюшкі, вялікім прыхільнікамі якога былі Пуслоўскія. Вандалін загадаў аднавіць сядзібу Касцюшкаў, зрабіць там музей героя, а побач узвесці варты рыцарскай славы палац. Даручылі праект варшаўскаму архітэктару Францішку Яшчолду.

Пра раскошу Косаўскага палаца недарэмна ходзяць легенды. 12 вежаў, якія сімвалізуюць 12 месяцаў, шкляная падлога над акварыумам з рыбамі, карцінная галерэя, бібліятэка... Цалкам магчыма, быў і леў — магнаты любілі звярынцы. Вось толькі ці хадзіў ён бескантрольна па калідорах? Наўрад. Магчыма, у народнай памяці застаўся выпадак з уцёкамі драпежніка, альбо адмыслова распаўсюджваліся чуткі пра дзікага вартаўніка, каб адпужнуць патэнцыйных зладзеяў.

А вось тое, што жонка Вандаліна Пуслоўскага, Ядвіга з Язерскіх, ездзіла ўлетку на санях па дарозе, пасыпанай соллю, гісторыкі, здаецца, дапускаюць...

А вось пасля Вандаліна маёнтак перайшоў да яго сына Лявона, які цягаўся па Парыжах, заляцаўся да дам і быў заўзяты гулец. Адны кажуць, Косава прайграў у карты, другія кажуць — за даўгі аддаў... У адной крыніцы знайшла звесткі, што Лявон прадаў маёнтак за 700 тысяч рублёў князю Аляксандраву з Масквы. У другой, што бацька Лявона Вандалін яшчэ пры жыцці выставіў палац на продаж, каб дапамагчы расплаціцца з даўгамі сыну... У любым выпадку, Косава перастала належаць Пуслоўскім, палац пераходзіў з рук у рукі, з яго вывозілі ўсё каштоўнае, паціху руйнавалі... У такіх выпадках, кажуць, і прачынаюцца здані былой славы.





## Што бывае, калі пускаеш пісьменнікаў гасцяваць

А каб як найлепш пазнаць прывідаў палаца, звернемся да... пісьменніцы Элізы Ажэшкі.

Вандалін Пуслоўскі быў вядомы мецэнат, калекцыянер, аматар мастацтваў. У яго гасцявалі Генрык Сянкевіч і Напалеон Орда... Эліза Ажэшка наведвалася не раз, пісала тут свае творы... У некалькіх крыніцах я знайшла згадкі, што свой раман «Паны Пампалінскія» 1876 года Ажэшка напісала, узяўшы некаторыя тыпы з сям'і Пуслоўскіх.

Што ж, падабенствы сапраўды ёсць. Прынамсі, адносіны паміж Вандалінам і Ядвігай Пуслоўскімі і іх сынам Лявонам сапраўды падобныя да апісаных у рамане адносін графа Ярослава Пампалінскага і ягонай жонкі з іх сынам Цэзарыем (часткова Лявон угадваецца ў іншым персанажы, Вільгельме, які прайграе ў Парыжы прызначаныя для фабрыкі грошы).

«У павеце, дзе знаходзіцца маёнтак Пампалінскіх, успыхнула эпідэмія даволі малавывучанай хваробы. Хвароба хутка спасцігла многіх. Усім панам N-скага павета, хто хоць троху сябе паважаў, закарцела абзавесціся радавым дваранскім прозвішчам. Шляхціцы ліхаманкава корпаліся ў сямейных архівах; пачалася форменная аблога тых устаноў, дзе захоўваліся радаводныя кнігі. У поце твару раскопваліся даўно сатлелыя, паўзабытыя рэшткі, і на свет божы выцягваліся, а то і наноў сачыняліся хоць колькі праўдападобныя прозвішчы і прыдомкі, якія тут жа далучаліся да прозвішчаў. Толькі малодшаму з яснавяльможных братоў — Ярославу — не выпала шчасця валодаць ні палацам, ні асабняком у сталіцы. Справа ў тым, што ён успадчыннiў якраз тыя землі, дзе ўзводзіўся знакаміты будынак, які ўжо параўноўваўся з Кёльнскім саборам, хоць гэта быў хутчэй Ватыкан у мініяцюры. Будаўніцтва яго ён палічыў справай гонару і сваім свяшчэнным сыноўскім абавязкам».

Згадзіцеся, Ярослаў цалкам супастаўны з малодшым сынам Войцеха Пуслоўскага Вандалінам — старэйшым братам дасталася варшаўская спадчына, а яму — Косава, дзе ён і ўзвёў гатычны будынак «у стылі Кёльнскага сабора».

А згаданыя апантаныя росшукі ў архівах сапраўды былі — у Расійскай імперыі некалькі разоў праводзілі перапіс шляхты, і кожны мусіў пацвердзіць паходжанне.

Яшчэ падабенства... Як бачыце, Ажэшка вельмі здзекліва высмейвае шляхецкую пыху, пагоню за тытуламі. Паны Пампалінскія ў яе аповесці таксама пнуцца пацвердзіць сваё старажытнае паходжанне і нават настойліва спрабуюць здабыць у Папы Рымскага графскі тытул.

Пуслоўскія таксама змагаліся за графскі тытул, гэтак жа ездзілі ў Рым, да Папы Рымскага, Пія IX, і гэтак жа іх тытул не прызналі на Радзіме.

Праўда, застаецца ў мяне пытанне... Эліза Ажэшка, гледзячы па ўсім, была ў сяброўскіх адносінах з Пуслоўскімі, гасцявала ў іх... А твор настолькі з'едлівы, так бязлітасна выкрывае герояў... Ці была такая бязлітаснасць патрэбай мастацкай праўды, якая мацнейшая за сяброўства, ці таго сяброўства аднойчы не стала?

## Графіня ў чорным

Дык хто ж такая Чорная дама Косаўскага палаца?

Паводле легенды, яна асабліва чула рэагуе, калі нехта лаецца альбо нецвярозы... Маўляў, гэта пані Ядвіга Пуслоўская падобным чынам гневалася на шалапутныя паводзіны сына Лявона, якія прывялі да таго, што Пуслоўскія страцілі гэты палац.

У рамане Элізы Ажэшкі ў графа Ярослава ёсць жонка, княгіня Ікс. «Яна правяла большую частку сваёй маладосці ў Парыжы і выдатна ведала, што прынята ва ўсіх Сен-Жэрменскіх прадмесцях свету і што ёй належыць паводле нараджэння, становішча і сувязяў. З ёю ў дом Пампалінскіх увайшоў невядомы яму дагэтуль вялікасвецкі шык... Толькі ўзводзімае ў Літве падабенства Ватыкана трохі ўзгнагароджвала яе...»

Ці не з'яўляецца прататыпам княгіні Ікс Ядвіга Язерская, дзеля запытаў якой узвёў Вандалін у Косаве «падабенства Ватыкана»? Уліўваючы выхадку з яздой па солі, якраз у гэтым духу персанаж.

«Гэта была станістая, высокая жанчына. Яе лёгкая, але паважная хада, горда ўскінутая галава, пяшчотны, белы, хоць пакрыты ўжо сеткай маршчын твар, ганарысты і ўладны погляд вялікіх чорных вачэй, у якіх яшчэ не згасла былое полымя, упэўненыя рухі і манера трымацца — нішто не выдавала ў ёй пакорлівасці, дабрадзейнасці ды іншых цнот праведніцы, якой яна была на думку свету... Чорная сукенка з дарагога шоўку ціха шаргатала па дыване, што высціла ў падлогу галерэі. На шыі, у пене бялюткіх, тонкіх, як павута, карункаў танула венецыянская брошка авальнай формы з выявай храма святога Пятра. Чорныя з сівізной валасы неахайна абвівалі такія ж карункі...»

Згадзіцеся, персанаж, які цалкам падыходзіць на ролю прывіднай Чорнай дамы!

Не ведаю, наколькі героі Ажэшкі спісаныя з натуры — напэўна ж, назіранні сінтэзаваныя з фантазіяй, а мо і наадварот многае зменена, каб не было пазнавальнае...

Цікава і тое, што пахавальня роду Ажэшкаў у Заказелі пабудавана па праекце таго самага архітэктара Францішка Яшчолды, у тым самым гатычным стылі.

Так што калі збярэцеся наведаць Косава — а пабываць там трэба абавязкова, каб палюбавацца, як аднаўляецца «рыцарская мара», — памятайце, што Чорная дама застанецца вельмі незадаволеная, калі не ўбачыць належных паводзін. Магчыма, удасца вам і пачуць прывідны рык ільва... А вось падземны ход у 25 кіламетраў да Ружан, кажуць, даследчыкі, выдумка.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

# Шляхецкія дуэлі, старажытная музыка і сакрэты княжацкай кухні

## Як прайшла «Ноч музеяў» у Нясвіжы



**Сёлета асноўныя падзеі «Ночы музеяў» прыпалі на 22 і 23 мая. Сярод мерапрыемстваў, якія прапанаваў арганізатары, абраць нешта адно было вельмі складана — настолькі разнастайныя і цікавыя былі актыўнасці. На «Ноч музеяў» мы вырашалі з'ехаць з Мінска і наведаць самы знакаміты беларускі замак. Зразумела, што Нацыянальны гісторыка-культурны музей «Нясвіж» проста не мог не прыняць удзел у «Ночы музеяў».**
**Чым здзівіў замак Радзівілаў — чытайце ў рэпартажы «Звязды».**

### СУСТРЭЧА З ПАНЕ КАХАНКУ

У Нясвіж мы прыехалі ў другой палове дня. Горад сустрэў сапраўды майскім надвор'ем, а яшчэ — квітнеючым бэзам і пахмурным, пераднавальнічным небам. Дарога ад цэнтра горада да замка займае хвілін сем. Гэты цікавы скачок з сучаснасці ў мінулае можа дазволіць сабе не кожны горад. Але Нясвіж з лёгкасцю мяняе крамы, каву на вынас і аўтобусныя прыпынкі на Бернардзінскую сажалку і першы на тэрыторыі Рэчы Паспалітай езуіцкі касцёл.

Першае, на што мы трапілі, была праграма «Па залах і эпохах». Гэта анімацыйная экскурсія, дзе падчас прагулкі па палацавых залах наведвальнікі знаёміліся з уладальнікамі замка розных гістарычных эпох. Мікалай Хрыстафор Радзівіл Сіротка распавядаў пра свае падарожжы ў Святую зямлю, Пане Каханку дзяліўся неверагоднымі гісторыямі, а Марыя Ружа Браніцкая адкрывала некаторыя сакрэты княжацкай кухні. Праз такі анімацыйны ход экспазіцыя замка быццам бы ажывала. Але, прызнаемся шчыра, у некаторыя моманты мы наўмысна адставалі ад экскурсавода і разглядалі замкавыя памяшканні самі. Уявіце сябе: пусты, багата ўпрыгожаны пакой. Ты застаешся сам-насам з эпохай, якая даўно сышла. Праз вокны бачны шпілі замка, сажалка, пахмурнае неба. Не трэба ніякіх экскурсаводаў, каб адчуць атмасферу старога Нясвіжа.

### БЛЯСК ЗАЛАТОЙ ЗАЛЫ

Агледзеўшы ўсю замкавую экспазіцыю, з лёгкасцю можна назваць тры месцы, якія нельга прапусціць. Знаёміцца з імі можна як у адзіночку, так і разам з экскурсаводам. Падымайцеся па трэці паверх і адразу ідзіце ў Залатую залу. На гэта немагчыма глядзець без захаплення. Калісьці Залатая зала была ўпрыгожана сусальным золатам — менавіта ад гэтага і пайшла яе назва. Рэстаўратары паспрабавалі аднавіць былую раскошу: зараз, калі вы паглядзіце на сцены або столь, ад залацістага бляску муроў у вас забаляць вочы. А калі ў пакой трапляюць сонечныя прамяні — можна толькі ўяўляць, якая прыгажосць.

Адразу з Залатой залы будзе праход у калекцыйны кабінет мінералаў. Там можна падзівіцца дзвюм рэчам. Першая — якія разнастайныя захапленні былі ў роду Радзівілаў. Другая — якія ўсё ж такі дзіўныя і непаўторныя рэчы стварае прырода. Гаворка ідзе аб калекцыі мінералаў. Малахіты, сапфіры, каменныя пароды: каб дасканала агледзець усю экспазіцыю, мы выдаткавалі не менш, чым пятнаццаць хвілін. Але час прайшоў незаўважна.



### ДВУБОІ І БАЛЯВАННІ

Асноўная праграма «Ночы музеяў» у Нясвіжы пачалася а шостай гадзіне. Фестываль праходзіў пад назвай «Радзівіліяда» і дэманстраваў культуру, воінскія традыцыі і музыку XVI—XVIII стагоддзяў. Дарэчы, фестываль праводзіўся пры падтрымцы ЕС у рамках трансгранічнага праекта «Захаванне і адаптацыя спадчыны князёў Радзівілаў для развіцця турызму ў Кедайняй і Нясвіжы». Замкавая плошча запоўнілася рыцарамі, прыдворнымі дамамі, рамеснікамі і жыхарамі сярэднявечнага горада. Падчас тэатралізаванага прадстаўлення гледачы даведаліся, як выглядалі ліцвінскія мушкецёры. Некаторыя з самых маленькіх наведвальнікаў уразіліся настолькі, што пачалі плакаць. За мушкецёрамі на плошчу прыйшла шляхта ВКЛ. Адзін са шляхцічаў абразіў другога — так распачаўся бой на мячах. Але ўсё скончылася добра: і ліцвінская пяхота, і шляхта бавілі час разам, папіваючы нешта з паходных пляшак. Напэўна, нейкі старажытны напой.

Але эпоха Радзівілаў знакамітая не толькі сваёй ваеннай гісторыяй. Культурныя дасягненнямі нашых продкаў мы захапляемся дагэтуль. Так, падчас святочнай праграмы можна было ўбачыць выступленне тэатра старадаўняй культуры «Яварына». Але больш за ўсё запомніўся ансамбль старадаўняй музыкі «Кантрданс». Удзельнікі ансамбля выкладаюць музыку ў Баранавічах. Але падчас свята яны быццам бы ператварыліся ў прыдворных музыкаў. Эклектычная, але пры гэтым далікатная музыка разносілася па ўсім замкавым двары. Здавалася, што ўсё навокал прыціхла, каб не перашкаджаць.

Канешне ж, немагчыма было абысціся без гістарычнай рэканструкцыі. Так, падчас бою «Рэгімент Януша Радзівіла» гледачам прадэманстравалі тактыкі бою і манёўры атрадаў, гістарычнае фехтаванне і паказальны паядынак.

Вечар у замкавым комплексе Нясвіж завяршыўся вогненым шоу. Пад яркія ўспышкі мы развіталіся з сярэднявеччам і пакрочылі назад, да звыклай сучаснасці.

**Арына КАРПОВІЧ.**

---

Спяшайцеся!

# Жэўжык, Ёўнік,募чараўніца Свіцязянка...

## На выставе-конкурсе «Казкі і паданні майго краю» ў Гродне

**Нашы продкі ніколі не ведалі адзіноты. Побач з імі заўсёды нехта знаходзіўся: у лесе ды ў жыце, у дрыгве ды пад снапом, у гумне ды ў кутку запрыпечка... Схаваныя ад чалавечага вока звышнатуральныя сілы дапамагалі растлумачыць і нейкім чынам упарадкаваць з'явы навакольнага свету. Беларускія міфічныя істоты і казачныя персанажы да канца мая «прапісаліся» ў выставачнай зале Гродзенскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці.**

Усе, хто жадае, могуць паспець бліжэй пазнаёміцца з Жэўжыкам і Ёўнікам, зазірнуць у вочы таямнічаму купальскаму дзядку і пастаяць побач з Гаспадаром палёў. Іх чакаюць на ўнікальнай выстаўцы-конкурсе дэкаратыўна-прыкладнога і выяўленчага мастацтва «Казкі і паданні майго краю».

Таленавітыя ўдзельнікі гурткоў і студый выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, вучні дзіцячых мастацкіх школ і школ мастацтваў, навучэнцы сярэдніх спецыяльных і студэнты вышэйшых навучальных устаноў і асобныя адораныя канкурсанты Гродзеншчыны стварылі больш за 120 работ, аб'яднаных адзінай тэмай. Кожны твор адрозніваецца сваёй непаўторнай тэхнікай выканання і кампазіцыяй.

У выставачнай зале цэнтра сярод арыгінальных экспанатаў знайшоў сабе прытулак і клапатлівы захавальнік хатняга ачага — Дамавік. З гэтым добрым заступнікам можна не баяцца ні злыдняў, ні шатанаў і смела акунацца ў краіну магіі і чараўніцтва, створаную з дапамогай фарбаў, паперы, дрэва, гліны, саломкі, лямцу, тэкстылю і, вядома ж, бязмежнай фантазіі. Варта адзначыць, што многія з каларытных персанажаў, адлюстраваных на выстаўцы, не маюць аналагаў у сусветнай міфалогіі.

Таленавітыя прадстаўнікі розных рэгіёнаў Гродзенскай вобласці не абышлі ўвагай у сваёй творчасці і герояў мясцовых легенд. Белая Панна Гальшан, чараўніца Свіцязянка, Барбара Радзівіл, княжна Гражына — увасобленыя ў работах канкурсантаў вобразы ў чарговы раз даказалі, што ўсе без выключэння рэгіёны Гродзеншчыны адрозніваюцца багатай фальклорнай спадчынай, якую варта памятаць і шанаваць.





Кожны наведвальнік выставачнай залы мае магчымасць паўплываць на выніку конкурсу і аддаць свой голас за таго ўдзельніка, чыю работу ён палічыць самай вобразнай, арыгінальнай і яскравай.

Праект «Казкі і паданні майго краю» — не толькі цікавае падарожжа ў свет арыгінальнай народнай культуры, але і гарантаваная падтрымка казачных персанажаў, якія дакладна ведаюць, як дапамагчы добраму чалавеку.

**Ала БЯЛЬКЕВІЧ,**
**«Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці».**

**ЗАО «ПАТИО» объявляет об отзыве 2 наименований продукции в связи с признанием их несоответствующими отдельным стандартам Технических регламентов Таможенного союза**

**- Тостер REDMOND, модель RT-408**
**- Бутербродница TEFAL, модель 9000 s1**
**Для возврата продукции, в зависимости от способа приобретения указанных выше наименований потребители могут обращаться:**
**- в точки продаж**
**- на единую инфолинию торговой сети «5 ЭЛЕМЕНТ», тел. +375 17 359 59 59.**

УНП 100183195

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже не завершенного строительством незаконсервированного одноквартирного жилого дома и земельного участка в частную собственность

| | |
|---|---|
| Местонахождение не завершенного строительством незаконсервированного капитального строения | Брестская область, г. Ганцевичи, ул. Франциска Скорины, д.18 |
| Предмет аукциона | Продажа не завешенного строительством незаконсервированного жилого дома с продажей в частную собственность земельного участка |
| Целевое назначение использования земельного участка | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме), код согласно единой классификации назначения объектов недвижимого имущества –1 09 02) |
| Сведения о предмете аукциона | Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом: цокольный этаж, земельный участок площадью 0,1148 га, кадастровый номер 121650100001002941 |
| Инженерная инфраструктура | Возможность подключения водоснабжения, газоснабжения, электроснабжения |
| Подлежащие возмещению расходы, связанные с проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения, бел. руб. | 337,23 |
| Начальная цена предмета аукциона | 16 395,33 |
| в том числе: | |
| начальная цена на не завершенное строительством незаконсервированное капитальное строение, бел. руб. | 9 185,89 |
| начальная цена земельного участка, бел. руб. | 7 209,44 |
| Сумма задатка, бел. руб. | 1 639,00 |
| Организатор аукциона | Ганцевичский районный исполнительный комитет, г. Ганцевичи, ул. Октябрьская, 1, тел. (801646) 6-20-93, 6-20-12 |

Аукцион состоится **15 июня 2021 года** в 10.00 в здании райисполкома по адресу: г. Ганцевичи, ул. Октябрьская, 1, каб. 310.

Участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь и негосударственные юридические лица Республики Беларусь.

Гражданин, юридическое лицо (лично либо через своего представителя) подают в комиссию по проведению аукциона:

заявление на участие в аукционе с указанием предмета аукциона;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет райисполкома BY89AKBB36416072800371300000 в ЦБУ № 107 филиала № 802 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Ганцевичи, БИК банка AKBBBY21802, УНП 200098095, с отметкой банка.

Кроме того, в комиссию представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

Консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность. После подачи заявления исполком заключает с участником соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Аукцион проводится согласно Положению о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением СМ РБ от 23.03.2008 г. № 220, при наличии двух или более участников. Победителем признается участник, предложивший наибольшую цену.

Если аукцион признан несостоявшимся из-за того, что заявление на участие в нем подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона предоставляется этому лицу при его согласии с внесением платы за предмет аукциона в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 % (далее – единственный участник).

Победитель аукциона по продаже не завершенного строительством незаконсервированного жилого дома с продажей в частную собственность земельного участка (единственный участник) обязан:

в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона внести плату за выкуп не завершенного строительством незаконсервированного жилого дома и земельного участка в частную собственность в размере, определенном протоколом;

возместить расходы, связанные с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка;

осуществить в двухмесячный срок после принятия решения о предоставлении земельного участка государственную регистрацию права на земельный участок;

получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство жилого дома;

занять (освоить) земельный участок не позднее одного года после получения свидетельства (удостоверения) государственной регистрации права на него;

снять плодородный слой почвы в местах размещения строений и сооружений и использовать его на улучшение приусадебного участка;

завершить строительство объекта в сроки, определенные проектной документацией.

Осмотр предмета аукциона на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Подать заявление с прилагаемыми документами на участие в аукционе и ознакомиться с планом земельного участка можно по адресу: г. Ганцевичи, ул. Октябрьская, 1, каб. 202, с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 в рабочие дни с даты опубликования извещения до 10 июня 2021 года включительно.

**Организатор торгов: управляющий ООО «СДиТК» – ЧП «БелАнтикризисГрупп» (220131, г. Минск, а/я 185, тел. 8029-119-86-66).**

**Дата и место проведения торгов:** 28.06.2021 в 11.00 по адресу: г. Минск, 4-й переулок Кольцова, д. 51, оф. 618.

**Сведения о продавце:** ООО «СДиТК» **(**213134, Могилевская область, Могилевский район, Тишовский сельсовет, снп Буйничи, д. 3 (здание кормоцеха с поточной линией № 16)**).**

**Сведения о предмете торгов, начальная цена предмета торгов. Лот № 1:** седельный тягач Volvo FH12, 1996 г. в., гос. № АЕ50296, VIN YV2A4-B2A1SB142199 с установлением начальной цены в размере 62 889,11 бел. руб.

**Лот № 2:** полуприцеп бортовой тентовый Kogel SNCO 24, 2005 г. в., гос. № А5591А6, VIN WK0S0002400041851 с установлением начальной цены в размере 4 733,59 бел. руб.

**Порядок проведения торгов.** Шаг аукциона – 5 %. Победителем торгов будет объявлен покупатель, предложивший наибольшую цену. Договор купли-продажи подписывается в 10-дневный срок с даты подписания протокола по результатам торгов. В случае признания торгов несостоявшимися продажа предмета аукциона продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Задаток 5 % от стоимости предмета торгов должен быть зачислен на расчетный счет ООО «СДиТК» (УНП 790875808): BY12OLMP30127000144890000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X.

Заявки на участие принимаются по адресу: 220131, г. Минск, а/я 185 со дня публикации объявления до 15.00 25.06.2021.

**ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Строительный трест № 14» (продавец) извещает о проведении 9 июня 2021 года повторного открытого аукциона по продаже имущества в 12.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2**

| |
|---|
| **ЛОТ № 1:** изолированное помещение с инвентарным номером 350/D-152755 площадью 266,7 кв. м, назначение – помещение общественного питания, наименование – помещение общественного питания |
| **Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Привокзальная, 3а |
| **Информация о земельном участке:** кадастровый номер 340100000001000446, площадь 0,1933 га; целевое назначение – для эксплуатации и обслуживания общежития |
| **Начальная цена продажи с учетом НДС: 531 360,00** бел. руб. |
| **Задаток (1 %) с учетом НДС: 5 313,60** бел. руб. |

**Продавец:** ОАО «Строительный трест № 14», г. Гомель, ул. Тельмана, 4. Контактные телефоны +375 29 338-64-56; +375 232 34-66-02.

**Шаг аукциона – 5 %. Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона (ООО «Деловая оценка»):**

**р/с BY60BELB30121322650030226000** в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, ул. Советская, 71, **БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с 10.00 до 13.00 и 14.00 до 17.00 от даты опубликования настоящего извещения. **Прием заявлений заканчивается 07.06.2021 в 17.00.**

**Для участия в аукционе представляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем (далее – ИП) Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юр. лица или ИП; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным ИП – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юр. лица Республики Беларусь – доверенность; представителем гражданина или ИП Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или ИП – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия.

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти)** календарных дней с момента подписания протокола; стоимость, сформированная в результате аукциона, должна быть выплачена продавцу в течение **30 (тридцати)** календарных дней с момента подписания договора купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение в размере 3 % от цены продажи предмета аукциона организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости объекта. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62 и на сайте www.deloocenka.by**

## Сведения о результатах проведения рекламной игры «Апрель на Драйве! Мастеркард»

**1.Сведения об организаторе**

Организатором рекламной игры является общество с ограниченной ответственностью «Рефорте», УНП 100422707 (далее – Организатор) с местом нахождения по адресу: 220030, Беларусь, г. Минск, пл. Свободы, д. 4, офисное помещение № 334. Электронный адрес: post@forte.by.

**2. Наименование рекламной игры**

«Апрель на Драйве! Мастеркард».

**3. Срок начала и окончания рекламной игры**

1 апреля 2021 г. – 16 июня 2021 г.

**4. Сведения о государственной регистрации рекламной игры**

Рекламная игра зарегистрирована в Министерстве антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь 17 марта 2021 года, свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3957.

**5. Сведения о количестве участников рекламной игры**

В рекламной игре приняло участие 50807 участников.

**6. Сведения о полном или частичном розыгрыше призового фонда:**

Призовой фонд разыгран полностью.

**7. Фамилия, инициалы победителя (победителей), его выигрыш (их выигрыши)**

| Наименование Приза | Ф.И.О. Победителя |
|---|---|
| Автомобиль: КИА RIO_FB<br>Год выпуска: 2021<br>Цвет кузова: черный<br>стоимостью 30 850,00 белорусского рубля<br><br>и денежные средства в сумме 4 587,36 белорусского рубля, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости приза | Клименок К. Л. |

**8. Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры**

+375 29 678 94 39.

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Слуцкий сыродельный комбинат» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже **капитального строения с инв. № 644/С-3262 (наименование – магазин) общей площадью 174,6 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 625050100001001576 *(право постоянного пользования)* площадью 0,0965 га по адресу: Минская область, Солигорский район, г. Солигорск, ул. К. Заслонова.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 141 600,00** бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены (**14 160,00** бел. руб.).

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 4 (четырех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **29.06.2021** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **24.06.2021** до **16.00** по указанному адресу **в каб. 320**. **Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, телефоны для осмотра: (80174) 28-16-31, (029) 853-68-09.**

УНП600119098

## ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества ОАО «Барановичская СПМК-2» (УНП 200167456), объявляет о проведении 25.06.2021 в 10.00 публичных торгов в электронной форме на электронной торговой площадке bankrottorg.by

**Предметы торгов:**

